Прилетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 70 к.
„ 3 „	2 р. — к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	7 р. — к.

Зьмена адрасу: іншагародняя—20 к. мясцовыя—10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок нанпаролі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок нанпаролі насперад тэксту 1 р. — к.
За радок нанпаролі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьценныя на 50 проц. даражэй.
Зьніж тарыфу бароцца 10 проц. ізлогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант . . . 35 кап.
За кожны дадатковы . 15 „
Беспрадоўн. і чырвонаармейцы за дакумант . . 15 „
За кожны дадатковы . . 5 „
Публікацыі ЗАГС—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддаленьніх Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.

АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

8 ГОД ВЫДАЧЫ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 279 (2171) Пятніца, 9-га сьнежня 1927 г.

XV ЗЬЕЗД УсеКП(б).

Рэзалюцыя зьезду па справаздачы ЦК. (Ухвалена аднагодна).

Капіталістычны сьвет напярэдадні войн і пралетарскіх рэвалюцый.

ЗАДАЧЫ ПАРТЫІ: няўхільна праводзіць палітыку міру, поруч з замацаваньнем і пашырэньнем братэрскіх сувязяў рабочых СССР з заходня-эўрапейскім пралетарыятам і працоўнымі калёній; няўхільна ўзмацняць абарону краю.

Сёньнешнія посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў краі--вынік правільнае палітыкі ЦК.

ЗАДАЧА ПАРТЫІ: сучасную генэральную ўстаноўку на індустрыялізацыю краю яшчэ шчыльней увязаць з курсам на рацыяналізацыю вытворчасьці і кіраўніцтва.

ЗЬЕЗД АБВЯШЧАЕ ПРЫНАЛЕЖНАСЬЦЬ ДА ТРАЦКІСЦКАЕ АПАЗІЦЫІ НЕСУМЯСЬЦІМАЮ СА ЗВАНЬНЕМ ЧЛЕНА БАЛЬШАВІЦКАЕ ПАРТЫІ.

Зьезд поўнасьцю ўхваляе палітычны і арганізацыйны напрамак ЦК.

XV Зьезд Усесаюзнае Камуністычнае Партыі (бальшавікоў) **цалкам ухваляе палітычны і арганізацыйны напрамак Цэнтральнага Камітэту.** Зьезд адзначае, што **правільная палітыка ЦК** забясьпечыла ў самых цяжкіх умовах справаздачнага перыяду ўзмацненьне міжнароднае магутнасьці СССР, павышэньне ролі нашага краю, як фактару міжнароднага міру, рост аўтарытэту СССР, як прытулку сусьветнага рэвалюцыйнага руху.

Дзякуючы палітыцы ЦК, унутры краю былі дасягнуты сур'ёзныя посьпехі ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва, няўхільна ўзьніміліся вытворчыя сілы ў горадзе і вёсцы пры пераваже сацыялістычных элемэнтаў ва ўсёй эканоміцы, павялічыўся матар'яльны і культурны ўзровень рабочых і сялянскіх мас, узмацняўся Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік на аснове правільнага правядзеньня ленінскае нацыянальнае палітыкі, узмацняўся саюз рабочае клясы з сялянствам, узрастаў кіруючы ўплыў пралетарыяту і яго партыі і ў цэлым—сыстэматычна ўмацоўваліся пазіцыі пралетарскае дыктатуры.

1. АЦЭНКА МІЖНАРОДНАГА СТАНОВІШЧА.

У сучасны момант пралетарская дзяржава, рабочая кляса і партыя распачынаюць сваю працу пры наличчы шмат у чым зьмененых міжнародных і ўнутраных варункаў.

У галіне міжнароднай справаздачны перыяд выкрыў рад новых момантаў і характэрных рыс, якія вызначаліся, як у самым лягеры імпэрыялізму так і ва ўзаемадачыненьнях капіталістычных краёў і Савецкага Саюзу. Адзначаная яшчэ на XIV зьезьдзе частковая стабілізацыя капіталізму досыць выразна выявіла да сучаснага моманту сваю істоту і разгарнула захаваныя ў ёй супярэчнасьці. Не зважаючы на вядомы рух наперад капіталістычных дзяржаў, не зважаючы на рост сусьветнае вытворчасьці за даваенныя **межы**, не зважаючы на аднаўленьне сусьветнага тавараабароту і ўмацаваньне грашовых валют, не зважаючы на некаторую «нармалізацыю» міжнародных адносін, не зважаючы на частковы прагрэс тэхнікі і капіталістычную рацыяналізацыю, не зважаючы на ўсё гэта і ў вядомай меры на падставе гэтага—**незамірныя супярэчнасьці сусьветнае капіталістычнае сыстэмы абастрыліся.** Абастрылася нераўнамернасьць разьвіцьця капіталістычных краёў і, на аснове яе, **барацьба за сфэры гаспадарча-палітычнага ўплыву і за перадзел сьвету.** Абастрылася інтэрнацыянальная барацьба **за рынкі збыту, сыравіны, за сфэры ўкład капіталу** з-за неадпаведнасьці вытворчых магчымасьцяў імпэрыялістычнае гаспадаркі платаздольнаму попыту абязздольваемых капіталізмам мас жыхарства, з-за хранічнае недагрузкі капіталістычнага вытворчага апарату, з-за аднаду такога вялічэзнага рынку, як СССР, ад сусьветнае сыстэмы капіталістычнае гаспадаркі.

Абастрыліся **супярэчнасьці між** эўрапейска-амэрыканскімі краямі—**матраполіямі**—з аднаго боку, **і залежнымі краямі і калёніямі**—з другога, прычым барацьба залежных краёў проці імпэрыялістычнага прыгнечаньня стала набываць форму ўзброеных паўстаньняў, нацыянальных войн калёніяльных рэвалюцый (Кітай—Індазія).

Абастрылася **барацьба клясаў у імпэрыялістычных краёх,** дзе ў адказ на наход капіталу на рабочую клясу і па яе жыцьцёвы ўзровень, у адказ на ліквідацыю 8-мігадзіннага працоўнага дню і эксплёататарскую рацыяналізацыю, у адказ на рэакцыйна-мілітарысцкую палітыку кіруючых буржуазных груповак—**рабочая кляса пачынае пераходзіць у контрнаступ.**

Абастрыліся **супярэчнасьці між краямі буржуазнага абкружэньня і СССР,** які сваім пераможным разьвіцьцём падрывае асновы сусьветнага капіталістычнага напаваньня. **Рост сацыялістычных элемэнтаў у СССР, крах буржуазных надзей на перараджэньне пралетарскае дыктатуры, поруч з павялічэньнем міжнарода-рэвалюцыйнага ўплыву СССР,**—зьяўляюцца галоўным фактарам гэтага абастрэньня. Такім нарадкам, капіталістычнае разьвіцьцё ў цэлым выявіла **тэндэнцыю скараціць гістарычныя тэрміны мірнае «перадышкі»,** наблізіць новую паласу вялікіх гістарычных войн і паскорыць рэвалюцыйную разьвязку сусьветных канфліктаў.

Для СССР гэта азначае, **перш-наперш,** нарастаючую напружанасьць адносін з буржуазнымі дзяржавамі, **палітыка якіх,** не зважаючы на рад унутраных супярэчнасьцяў між дзяржавамі і асобнымі групамі буржуазеі, перашкаджаючымі заснаваньню адзінага капіталістычнага фронту, робіцца **ўсё больш і больш варожаю ў адносінах да СССР** і стварае непасрэдную пагрозу імпэрыялістычнага нападу звонку.

Мінулая двухгадовая паласа міжнароднага разьвіцьця лішні раз наглядна паказала, што патугі буржуазных і нацыфісцкіх палітыкаў «аб'яднаць» і «замірыць» дзяржавы на капіталістычнай аснове былі дарэмнымі. Нескончоныя аб'яднаўчыя канфэрэнцыі і камісіі Лігі Нацый, так зв. «маніфэст банкіраў», дэклярацыя проці пасьляваэрсальскае мытнае вакханаліі, міжнародная эканамічная канфэрэнцыя, нацыфісцкі праэкт «пан-Эўропы», жэнеўская канфэрэнцыя трох дзяржаў аб „разброеньні",—выкрылі сябе, як новы абман рабочае клясы. «Аб'яднаўчыя» спробы толькі прыкрывалі шалёнае спаборніцтва імпэрыялістаў за кусамі прыгнечаных краёў;

в) на падставе **далейшага сыстэматычнага разьвіцьця эканамічнае сувязі з капіталістычнымі краямі пры забясьпечаньні росту гаспадарчае самастойнасьці Савецкага Саюзу;**

г) на падставе **бязупыннага ўзмацненьня абароназдольнасьці краю,** сілы і баявое здольнасьці рабоча-сялянскае Чырвонае арміі, паветранага і марскога флёту;

д) на падставе **накапленьня неабходных гаспадарчых рэзэрваў** (хлебных, таварных, валютных, спэцыяльных рэзэрваў абароны).

Задачы партыі ў галіне міжнароднай палітыкі.

Бяручы пад увагу пералічаныя варункі, якія характарызуюць сучасныя міжнародныя абставіны, 15-ты зьезд даручае Цэнтральнаму Камітэту **весьці далейшую працу:**

а) на падставе **далейшага правядзеньня няўхільнае палітыкі міру,** якая зьяўляецца палітыкаю барацьбы з небясьпекаю імпэрыялістычных войн і якая разам з тым зьяўляецца галоўнаю ўмоваю далейшага росту сацыялізму ў СССР;

б) на падставе **ўсямернага ўзмацненьня братэрснае сувязі рабочых СССР з рабочымі заходня-эўрапейскіх дзяржаў і працоўнымі ма-**

II. АЦЭНКА ГАСПАДАРЧАЕ ПАЛІТЫКІ ЦК.

15-ты зьезд лічыць **зусім правільнаю лінію і працу Цэнтральнага Камітэту ў галіне ўнутранае палітыкі і гаспадарчага будаўніцтва.**

На падставе ленінскае палітыкі ЦК было забясьпечана разгортваньне за даваенны ўзровень дзяржаўнае прамысловасьці пры росьце ліку занятых рабочых, пры росьце прадукцыйнасьці працы і заработку. Разгортваньне буйнае дзяржаўнае прамысловасьці правадзілася поруч з бязупынным узрастаньнем долі вырабу сродкаў вытворчасьці.

Неравышэньне прамысловасьцю даваенных норм, абнаўленьне асноўнага капіталу сацыялістычнае індустрыі, пачатак карэнных тэхнічна-вытворчых рэформ, значныя посьпехі электрыфікацыі, стварэньне і разьвіцьцё цэлых новых галін прамысловае вытворчасьці (машынабудаўніцтва, выраб варстатаў, аўтамабіляў, турбінаў, авіяпрамысловасьць, хімічная індустрыя), пабудова новых заводаў, буйных будынкаў і ўстановак і карэннае пераабсталяваньне старых заводаў—**вось тыя істотныя дасягненьні партыі і рабочае клясы на шляху індустрыялізацыі нашае краіны,** які быў вызначан 14-м партыйным зьездам.

Адначасна з дзяржаўнаю сацыялістычнаю прамысловасьцю **ўзрастала значэньне і ўсяе іншае сыстэмы камандных эканамічных вышынь пралетарскае дзяржавы:** транспарту, дзяржаўнага бюджэту, банкаўска-крэдытнае сеткі, гандлёвага апарату. Дзяржаўна-каапэрацыйны сэктар заняў рашаючыя пазіцыі на рынку, сыстэматычна **выціскаючы з яго прыватны гандлёвы капітал.**

Таксама пашырыліся, на аснове манаполіі замежнага гандлю, не зважаючы на паўбайкатысцкія манэўры капіталістычнага абкружэньня, нашыя замежныя гандлёвыя сувязі пры дасягненьні актыўнага сальдо гандлёвага балянсу.

Гаспадарчая палітыка партыі за мінулы час **спрыяла,** на аснове паступовага ўзмацненьня вядучае ролі сацыялістычнага гораду, **далейшаму разьвіцьцю сельскае гаспадаркі,** павялічэньню засеўнае плошчы, росту таварнасьці, укараненьню элемэнтаў больш высокае тэхнікі і агрыкультуры: пматноўля, тэхнічных культур, мэханізацыі сельска-гаспадарчае вытворчасьці.

Эканамічная змычка між горадам і вёскаю значна ўзмацнілася.

Разам з ростам сельскае гаспадаркі ўзрасла дастаўка вёсцы гарадзкіх прамтавараў, узрасло значэньне сельска-гаспадарчае каапэрацыі.

15-ты зьезд УсеКП(б) лічыць неабходным, аднак, адзначыць, што вышэйпамянёныя дасягненьні невыстарчальны і што ўзровень сельскае гаспадаркі ўсё яшчэ застаецца вельмі нізкім. У мец гэтага зьезд даручае Цэнтральнаму Камітэту **ўжыць практычныя захады для ўзмацненьня ўздыму сельскае гаспадаркі,** прычым адною з асноўных мер зьезд лічыць **хутчэйшае правядзеньне зямляўпарадкаваньня.**

Неабходна паставіць **у якасьці першачарговае задачы,** на падставе далейшага каапэраваньня сялянства, па-

Далейшыя задачы ў гаспад. галіне.

15 зьезд даручае Цэнтральнаму Камітэту **весьці і далей непаслабным тэмпам палітыку сацыялістычнае індустрыялізацыі,** якая дала ўжо свае першыя станоўчыя вынікі.

Усямерна ўмацоўваючы індустрыяльную магутнасьць СССР, партыя павінна **насупынна разгортваць,** выкарыстоўваючы палітычны фінансава-эканамічны сродкі, **выраб сродкаў вытворчасьці,** між іншым мэталюргію і машынабудаўніцтва, **разьвіваць унутры краю вытворчасьць прамысловае сыравіны** (бавоўна, воўна, скура і г. д.), **весьці і далей палітыку зьніжэньня сабекошту і няўхільна праводзіць палітыку зьніжэньня ЦЭН НА ПРАМЫСЛОВЫЯ ВЫРАБЫ. ГЕНЭРАЛЬНАЯ ЎСТАНОЎКА НА ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЮ НАШАГА КРАЮ ПАВІННА ПРАВОДЗІЦЦА ПОРУЧ З РАШУЧЫМ КУРСАМ НА РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫЮ ВЫТВОРЧАСЬЦІ І КІРАЎНІЦТВА.** Рацыяналізацыя вытворчасьці разам з паляпшаньнем і спрашчэньнем дзяржаўнага і каапэрацыйнага звароту на падыходзячы пярыяд зьяўляецца вузлавою задачаю. У інтарэсах павышэньня матар'яльна-культурнага ўзроўню жыцьця пралетарыяту, а таксама ў інтарэсах рацыяналізацыі вытворчага працэсу партыя агаласіла паступовы пераход да 7-мігадзіннага рабочага дню, пры далейшым павышэньні жыцьцёвага ўзроўню рабочае клясы, што зьяўляецца прынцыповаю адзнакаю нашых мэтадаў рацыяналізацыі ад мэтэдаў капіталізму, дзе рацыяналізацыя наадварот—выдзе да зьніжэньня жыцьцёвага ўзроўню і павялічэньня рабочага дню.

Заклікаючы ўсе партыйныя, гаспадарчыя, прафэсыянальныя і савецкія арганізацыі з усёй энэргіяй узяцца за вырашэньне **гэтае значнейшае задачы—сацыялістычнае рацыяналізацыі,** 15-ты зьезд УсеКП(б) лічыць, што толькі на яе аснове магчыма ажыцьцяўленьне індустрыялізацыі краю (уключаючай у сябе індустрыялізацыю і сельскае гаспадаркі), зьнішчэньне беспрацоўя, бюракратычных скажэньняў пралетарскае дзяржавы, задаволеньне ўзрастаючых патрэб рабоча-сялянскіх мас, іх далейшы культурны рост, перамога галоўных цяжкасьцяў сацыялістычнага будаўніцтва.

Не зважаючы на накіроўваючую і ўзрастаючую ролю сацыялістычнага гаспадарчага асяродку, уздым прадукцыйных сіл эканомікі СССР памінуча адбываецца разам з частковым нарастаньнем клясавых супярэчнасьцяў. Прыватна-капіталістычныя гушчы гораду і вёскі, якія злучаюцца в некаторымі бюракратычнымі элемэнтамі савецкага і гаспадарчага апарату, імкнуцца павялічыць сваё процідзеяньне наступу рабочае клясы, спрабуюць рабіць варожы пралетарскай дыктатуры ўплыў на азначаныя гушчы служачых і інтэлігенцыі, на адсталыя гушчы саматужнікаў і рамесьнікаў, сялян і рабочых. Гэты ўплыў выяўляецца таксама ў галіне культурна-палітычнай і ідэалёгічнай (пропаведзь зьменавехаўства, лёзунг кулацкага «сялянскага саюзу», шавінізм, антысэмітызм, буржуазна-дэмакратычныя «свабоды» і зьвязаны з гэтым дробна-буржуазны апазіцыйны лёзунг двух партый і г. д).

Гэтаму варожаму ўплыву і растучай актыўнасьці капіталістычных элемэнтаў рабочая кляса на чале з УсеКП(б) проціпаставіла ўзмацненьне рэжыму пралетарскае дыктатуры, яшчэ большы ўздым актыўнасьці, самадзейнасьці і культурнасьці пралетарскіх мас (ажыўленьне саветаў, разгортваньне прафэсыянае дэмакратыі і каапэрацыйнае грамадзкасьці, павялічэньне ідэёвага ўзьдзейнічаньня пралетарыяту на вёску, культурна-выхаваўчае працы ў масах і г. д., а таксама і павялічэньне ідэёвага ўплыву пралетарыяту на шырокія гушчы савецкае інтэлігенцыі).

Адзначаючы рад бясспрэчных посьпехаў на гэтым фронце барацьбы, зьезд лічыць патрэбным **І Ў ДАЛЕЙШЫМ ПРАВОДЗІЦЬ УСЯМЕРНУЮ МАБІЛІЗАЦЫЮ ПРАЛЕТАРСКІХ МАС І АСАБЛІВАЕ ЎЗМАЦНЕНЬНЕ БАРАЦЬБЫ НА ІДЭАЛЁГІЧНЫМ І КУЛЬТУРНЫМ ФРОНЦЕ.**

III. УНУТРЫПАРТЫЙНАЕ СТАНОВІШЧА І АПАЗІЦЫЯ.

Адзначаючы колькасны і якасны рост нашае партыі з часу XIV зьезду, цалкам ухваляючы палітыку Цэнтральнага Камітэту ў галіне парадкаваньня сацыяльнага складу партыі і адзначаючы **посьпех** «кастрычнікавага прызыву" рабочых у партыю ў зьвязку з 10-мі ўгодкамі савецкае ўлады, XV зьезд УсеКП(б) заяўляе, што **накіроўваючая роля УсеКП(б),** як асноўнага рычага дыктатуры, **можа быць захована, забясьпечана і ўзмоцнена толькі на аснове ленінскае згуртаванасьці і пралетарскае дысцыпліны радоў партыі,** пры нясупынным павялічэньні ідэёва-тэарэтычнага і культурнага ўзроўню яе сяброў, наступовым правядзеньні ўнутры-партыйнае дэмакратыі і сыстэматычным палепшаньні сацыяльнага складу партыі, праз вярбоўку ў партыю рабочых і работніц з вытворчасьці.

Зьезд лічыць патрэбным, асабліва з прычыны складанасьці задач, якія стаяць перад партыяй і з мэтаю павялічыць актыўнасьць усёй масы сяброў партыі,—**разьвіць унутрыпартыйную дэмакратыю, дзелавую крытыку недахопаў** як у савецкім апараце, так і ў самой партыі, **узмацніць барацьбу з кар'ерызмам** і г. д. і г. д.

Адначасна з гэтым зьезд зварочвае ўвагу партыі на патрэбу **ўзмацніць працу ў камсамоле, сярод рабочае моладзі наогул і сярод жанчын.**

XV зьезд сьцьвярджае, што, не зважаючы на папярэджаньні XIII зьезду партыі, які адзначыў «дробна-буржуазны ўхіл» групы Трэцкага, і не зважаючы на папярэджаньне 15-е ўсесаюзнае партканфэрэнцыі аб «сацыял-дэмакратычным ухіле» аб'яднанае пад кіраўніцтвам Троцкага апазіцыі, аноння ня спыняла з месяцу ў месяц паглыбляць свае рэвізіяністкія памылкі, праводзіць барацьбу проці УсеКП(б) і вучэньня Леніна, пабудаваўшы сваю асобную партыю, выносячы барацьбу за межы УсеКП(б), апэлюючы да непралетарскіх элемэнтаў у краі, проці рэжыму дыктатуры пралетарыяту.

ІДЭАЛЁГІЯ АПАЗІЦЫІ, якая адкрыта зблёкавалася з рэнэгатамі міжнароднага камунізму (Маслаў—Суварын і К-°), у сучасны момант склалася і аформілася, як **МЕНШАВІЗМ** у яго сваяўласьцівай трацкісцкай фармулёўцы. Адхіленьне сацыялістычнага характару савецкіх дзяржаўных прадпрыёмстваў, адхіленьне магчымасьці пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва ў нашым краі, адхіленьне палітыкі саюзу рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства, адхіленьне арганізацыйных прынцыпаў бальшавізму (палітыка расколу УсеКП(б) і Камінтэрну), лёгічна прывялі трацкісцка-меншавіцкую апазіцыю да паклёпу на СССР, як на перароджаную тэрмідарыянскую дзяржаву, да адхіленьня пралетарскае дыктатуры ў СССР і контр-рэвалюцыйнае барацьбы проці яе. У выніку **апазіцыя ідэёва парвала з ленінізмам, перарадзілася ў меншавіцкую групу, стала на шлях капітуляцыі перад сіламі міжнароднае і ўнутранае буржуазеі і абярнулася аб'ектыўна ў зброю трэцяе сілы проці рэжыму пралетарскае дыктатуры.**

Якраз з гэтае прычыны апазіцыя атрымала такі моцны адпор як з боку ўсяе масы сяброў партыі, так і з боку рабочае клясы цалкам.

Усе пастановы ЦК і ЦКК, накіраваныя проці дэзарганізатарскае працы трацкістаў, XV зьезд лічыць **абсалютна правільнымі і мінімальна-неабходнымі і даручае ЦК і наперад забясьпечваць ленінскае адзінства партыі,** чаго-б гэта ні каштавала.

Бяручы пад увагу, што разнагалосьсі між партыяй і апазіцыяй з тактычных перарасьлі ў праграмныя, што трацкісцкая апазіцыя аб'ектыўна стала фактарам антысавецкае барацьбы, **XV ЗЬЕЗД АБВЯШЧАЕ ПРЫНАЛЕЖНАСЬЦЬ ДА ТРАЦКІСЦКАЕ АПАЗІЦЫІ І ПРАПАГАНДУ ЯЕ ПОГЛЯДАЎ НЕСУМЯСЬЦІМЫМІ З ПАБЫТАМ У РАДОХ БАЛЬШАВІЦКАЕ ПАРТЫІ.**

Ад імя УсеКП(б), ад імя рабочае клясы Савецкага Саюзу XV зьезд выказвае цьвёрдую пралетарскую ўпэўненасьць у перамозе сацыялізму ў нашым краі, не зважаючы на ўсе цяжкасьці.

Сусьветна-гістарычны вопыт 10-цігадовага існаваньня дыктатуры пралетарыяту надзвычайна добра пацьвярджае правільнасьць ленінскага шляху, па якім ідзе УсеКП(б).

XV зьезд прапануе ЦК няўхільна **ісьці па гэтым шляху далей,** згуртоўваць пад сьцягам сацыялістычнага будаўніцтва ўсё большыя масы працоўных нашага краю, узмацняць братэрскую сувязь салідарнасьці з пралетарыятам усіх краёў, **рабіць СССР з кожным годам усё больш магутным фарпостам сусьветнае сацыялістычнае рэвалюцыі.**

ЗАМЕСТ АДЗІНАК--СОТНІ.

(Ліст са зьезду).

Абмеркаваньне дакладу т. Сталіна... Выступленьні працаўнікоў з месц.

Кожнае з гэтых выступленьняў—суровы ўдар па апазіцыі, проста ці ўкосна. Проста—калі таварышы з месц апавядаюць аб тэй злачынній, раскольніцкай працы, якую вядзе апазіцыя ў іх губэрніях, акругах. Кожны новы пададзены факт выклікае аднадушнае абурэньне ўсяе залі. Асабліва абураны зьезд, калі т. Угланаў, кіраўнік маскоўскае арганізацыі, паказвае зьезду падпольны «бюлетэнь», выпушчаны і распаўсюджаны апазіцыйнымі папярэдні самага зьезду.

І ня дзіва, што зьезд галасамі «правільна» ўхваляе словы т. Кагановіча, што ніякім «пакаянным» заявам апазіцыі верыць нельга.

Але самыя моцныя ўдары апазіцыя атрымлівае тады, калі працаўнікі з месц апавядаюць аб посьпехах нашага будаўніцтва.

Тав. Кагановіч гаворыць аб посьпехах прамысловасьці на Украіне. Рабочы Газа—аб тым, як Пуцілаўскі завод у Ленінградзе павялічыў вытворчасьць з 19 міліёнаў да 32 міліёнаў руб. Ібрагімаў з Узбэкістану—як 120 тысяч батрацкіх гаспадарак атрымалі там зямлю... Гантман з Беларусі. Падобныя-ж весткі перадалі зьезду і шмат іншых таварышоў.

І пасьля ўсіх гэтых фактаў,—якімі нікчэмнымі здаюцца ўсе паклёпы апазіцыі, якія распаўсюджваюцца нават заграніцаю, што ў нас усё кепска, што мы гінем, што партыя і савецкая ўлада вядзе няправільную палітыку... Каменя на камені не застанецца ад апазіцыйных фальшывых вымыслаў...

Зьезд з нецярплівасьцю чакае, што цяпер скажа апазіцыя, як яна будзе цяпер бараніцца перад тварам усяго зьезду.

У залі пасаджэньня апазіцыянэры прысутнічаюць. Ім даўдзен дарадчы голас. Яны нават запісаліся гаварыць. Але вось падыходзіць іх чарга. Старшыня тав. Рыкаў выклікае: «Слова мае т. Каменеў*).

Увесь зьезд настражыўся ў пачаканьні аднаго з «правадыроў» апазіцыі. Але Каменеў ня вышаў. Ці таму, што не адважыўся: духу не хапіла стаць перад партыяю; ці таму, што яны яшчэ не згаварыліся, што ім рабіць, у які бок гнуць сваю лінію. Магчыма і тое і другое. Але ў кожным выпадку, у гэты дзень зьезду не ўдалося даведацца, якую новую штуку **прыдумала** апазіцыя, каб ашукаць партыю.

Гавораць, што апазіцыя падала якуюсь новую заяву ў прэзыдыум зьезду.

Слухаючы выступаючых таварышоў асабліва дзівіла тое, як узрасьлі нашыя працаўнікі з месц.

Кожнае іх выступленьне—сур'ёзнае, дзелавое, прадуманае, за якім чуецца вялікая праробленая на месцах праца.

Вось гэта сапраўды новыя правадыры партыі і працоўных мас! Правадыры, якія кроўна спаяны з масамі, жывуць іх патрэбамі і інтарэсамі і пільна прыслухоўваюцца да іх патрэб.

Гэта—і практычныя працаўнікі, і дзяржаўныя дзеячы, і добрыя партыйцы.

І сьмела можна сказаць: нам ні трошкі из страшны выхад некалькіх ранейшых правадыроў, бо замест некалькіх адзінак, адарваных ад мас, у нас ужо маюцца сотні новых кіраўнікоў, якія здолеюць павесьці далей справу будаўніцтва сацыялізму.

М. Б—і.

6-XII-27 г.
Масква.

*) Гэты ліст быў напісаны да выступленьня прадстаўнікоў апазіцыі.

XV зьезд УсеКП(б).

Раніцняе пасяджэньне 7-га сьнежня.

Заключнае слова тав. Курскага.

Зразумела, гаворыць т. Курскі, што ўся ўвага зьезду і ўсе спрэчкі на справаздачных дакладах ЦК і цэнтральнае рэвізійнае камісіі згуртоўвалася на пытаньнях палітычных і ўнутрыпартыйнага становішча, на пытаньнях барацьбы з апазіцыяй.

Аднак, гэтыя найбольш галоўныя пытаньні не павінны адсоўваць на другі плян значэньне важнейшых арганізацыйных пытаньняў, якія выцякаюць з справаздач ЦК.

Адзначыўшы, у чым вызначалася кіраўніцтва цэнтральнае рэвізійнае камісіі працаю мясцовых рэвізійных камісій, т. Курскі спыніўся ў кароткіх рысах на характарыстыцы і колькасьці ўсяго партыйнага апарату ў цэлым і прапанаваў мясцовым партыйным арганізацыям зьвярнуць у далейшым увагу на паляпшэньне працы рэвізійных камісій.

Заключнае слова тав. Касіёра.

Тав. Касіёр у заключнай прамове спыніўся на пытаньнях аб парадкаваньні партыйнага складу і потым даў весткі аб прыёме ў партыю сялян і служачых. З гэтых даных відаць, што прыём у партыю прадстаўнікоў гэтых сацыяльных груп у апошнія гады з году ў год зьмяншаецца.

Што-ж датычыць прыёму ў партыю сялян, дык нам неабходна мець на ўвазе,—гаворыць тав. Касіёр—задачу павялічэньня партыйнага ўплыву на асноўныя масы сялянства. Гэтым тлумачыцца і той факт, што прыток у партыю сялянства ў 1925 г. значна перавысіў прыток, які меў месца ў папярэднія гады.

Патрабаваньні апазіцыі—сказаў далей Касіёр—з якімі тут выступаў Баку аб зачыненьні для ўсіх груп жыхарства доступу ў партыю, мы ўхваліць ня можам. І ў гэтым няма патрэбы. Арганізацыйная праца ЦК і ўсіх партыйных арганізацый зрабіла за апошнія гады буйныя крокі наперад. Мы блізка падышлі да вырашэньня найбольш неадкладных арганізацыйных пытаньняў, мы іх добра намацалі. Але каб іх з посьпехам вырашыць, патрэбна, раней усяго, стварыць спакойныя, дзелавыя абставіны для працы. Трэба забясьпечыць гэтыя абставіны ад узрушэньняў, якія перажыла партыя ў зьвязку з працаю апазіцыі, трэба пазбавіць сябе ад апазіцыі.

Апошнія словы т. Касіёра пакрываюцца воплескамі.

Заключнае слова тав. Сталіна.

Тав. Сталін спыняецца на выступленьнях Ракоўскага і Каменева і падкрэсьлівае ўсю беспадстаўнасьць і нясьвітрасьць іх заяў.

Апазіцыя мае два твары, кажа т. Сталін: адным тварам яна зварочваецца да меншавікоў, другім, фарысейскім тварам—да партыі. Спробу апазіцыі арганізаваць проці партыі вулічныя дэманстрацыі тав. Сталін раўняе з лева-эсэраўскім путчам, падкрэсьліваючы, што ніякае прынцыповае розьніцы між гэтымі двума зьявішчамі няма.

Тав. Сталін адхіляе завярэньне Каменева, нібыта традыцыі партыі не дазваляюць патрабаваць ад яе сьпіроў адмовы ад фальшывых тэорый і поглядаў. Каменеў разам з ЦК сам патрабаваў гэтага ад так званае «рабочае апазіцыі», ад Мясьнікова і ад некаторых іншых. Вядома, што лідэры апазіцыі ня раз зьменьвелі свае прынцыповыя погляды. Так, напрыклад, Троцкі зараз адмовіўся ад выказанага ім у «уроках Октября» перакананьня, што Зіноўеў і Каменеў складаюць правае крыло партыі, а Каменеў і Зіноўеў у свой чарод адмовіліся ад свайго завярэньня, што трацкізм ёсьць галіна меншавізму.

Няма нічога дзіўнага, што некаторыя былыя лідэры выкідаюцца зараз з бальшавіцкага возу. Кожны раз, калі партыя робіць круты паварот, хто-небудзь выкінецца з возу. У 1903 годзе, калі партыя рабіла круты паварот, калі наўстала пытаньне аб барацьбе і проці лібэральнае буржуазеі, з бальшавіцкага возу былі выкінуты Пляханаў, Мартаў, Засуліч і Аксельрод. У 1907 г., калі партыя ізноў прымушана была зрабіць круты паварот, з бальшавіцкага возу былі выкінуты Багданаў, Аляксінскі, Ражкоў і некаторыя іншыя лідэры партыі. Неразумна, калі апазіцыя спрабуе аргумантаваць немагчымасьць здачы сваіх ідэёвых пазіцый большасьці ўдарыць па сваім прэстыжы. Апазіцыя, як відаць, хоча, каб партыя зьмяніла свой прэстыж, адмовіўшыся ад сваіх ідэёвых пазіцый, ад свайго ленінскага шляху. Ці ня сьмешна гэта? І ці не выклікае гэта абурэньня ў кожным сумленным сябры партыі?

Зварочваючыся да апазіцыі, т. Сталін патрабуе ад яе поўнае і безагаворачнае капітуляцыі, папераджаючы, што ў іншым разе яна паставіць сябе па-за партыяй.

Авацыя т. Сталіну.

Зьезд спатыкае тав. Сталіна авацыяй. Дэлегаты зьезду ўстаюць з сваіх месц, чуюцца выгукі „ура". Тав. Сталін у заключнай прамове спыняўся на выступленьнях прадстаўнікоў апазіцыі на зьездзе і на характарыстыцы праны апазіцыі па сутнасьці. Прамова т. Сталіна ня раз перапынялася гучнымі воплескамі зьезду.

Пасьля прамовы зьезд зноў наладжвае т. Сталіну авацыю.

* * *

Тав. Аляксееў ад імя маскоўскае, ленінградзкае, украінскае, уральскае, паўночна-каўкаскае, закаўкаскае, цэнтрально-прамысловае і паволскае дэлегацый агалашае праэкт рэзалюцыі па справаздачных дакладах ЦК, якая аднагодна ўхваляецца зьездам пад гучныя воплескі і выгукі «ура».

Зьезд зацьвярджае таксама і справаздачу цэнтральнае рэвізыйнае камісіі.

Справаздача ЦККі НК Р-СІ.

Даклад тав. Арджанікідзэ.

УВЕСЬ ЧАС ЦКК ІМКНУЛАСЯ ВЯРНУЦЬ ЗБЛУДЗІЎШУЮ АПАЗІЦЫЮ НА ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ. ДАЛЕЙШАЯ АБАРОНА АПАЗІЦЫЯЙ СВАІХ ПАМЫЛАК ПАСТАВІЦЬ ЯЕ ПА-ЗА ПАРТЫЯЙ.

ЦКК на варце партыйнага адзінства.

Потым са справаздачаю ЦКК і НК РСІ выступіў т. Арджанікідзэ. Першую частку свайго дакладу т. Арджанікідзэ прысьвечвае характарыстыцы працы ЦКК па ахове адзінства партыі. Т. Арджанікідзэ завярае, што ЦКК з свайго боку зрабіла ўсё, каб палегчыць апазіцыі спыніць унутрыпартыйную барацьбу і вярнуцца ў шэрагі партыі раней, чымся яна стала на шлях рэпрэсій, на шлях выключэньня з партыі лідэраў апазіцыі.

Апазіцыя хацела бачыць у ЦКК «лейяльную» арганізацыю, якая павінна выконваць функцыі заміраючае каморы між партыяй і апазіцыяй, але, зразумела, апазіцыя ў гэтым вельмі памылілася. Мы ня былі-б ленінцамі, калі-б мы абярнуліся ў якую-небудзь заміраючую камору. ЦКК з першых-жа крокаў руйнуючае дзейнасьці апазіцыі ўзяла ў адносінах да яе поўны напрамак, накіраваны да захаваньня адзінства партыі, да забясьпечаньня партыйнае дысцыпліны.

На якім шляху прайшла апазіцыя ад часу 14-га зьезду партыі. Зараз-жа пасьля 14-га зьезду апазіцыя спрабавала ўмацавацца ў ленінградзкай арганізацыі, спрабавала штурхаць гэтую арганізацыю на шлях непадпачаленьня настановам 14-га зьезду. Зараз-жа за гэтым апазіцыя наладжвае нелегальныя ясныя сходы, патрабуе ад ЦК дыскусіі, спрабуе явачным парадкам распачаць дыскусію і, урэшце, у апошнія месяцы перад 15-м зьездам апазіцыя засноўвае нелегальныя друкарні, робіць спробы апэляваць проці партыі да беспартыйных мас, наладжвае вулічныя дэманстрацыі. Такім чынам, апазіцыя ператвараецца з фракцыі, якою яна была раней, у партыю з сваёю праграмаю і з сваёю тактыкаю.

Што-ж рабіла ЦКК у той час, як апазіцыя разгортвала сваю злачынную працу? ЦКК зрабіла ўсё, што магчыма зрабіць, каб вярнуць апазіцыю на ленінскі шлях, з якога яна зышла. ЦКК выяўляла надзвычайную мяккасьць да апазіцыі. Вядома, напрыклад, што калі мясцовыя арганізацыі абвяліся на апазіцыйныя групы і пачалі выключаць з партыі апазіцыянэраў, дык ЦКК амаль 90 проц. гэтых выключаных аднавіла. Пасьля апэляцыі Зіноўева да беспартыйных мас, пасьля яго выступленьня ў Калённай Залі Дому Саюзаў, пасьля дэманстрацыі на Яраслаўскім вакзале мы папераджалі лідэраў апазіцыі аб тым, каб яны неадкладна спынілі сваю злачынную дасйнасьць. Мы папераджалі іх, што ад дэманстрацыі на Яраслаўскім вакзале адзін крок да дэманстрацыі каля Крамлёўскае брамы. На жнівеньскім пленуме ЦК мы вяждаліся з апазіцыяй некалькі дзён, і толькі дзякуючы выступленьням т. Сталіна і Молатава пленум накінуў у шэрагах партыі Зіноўева і Троцкага. Нашу дзейнасьць, накіраваную да таго, каб дапамагчы лідэрам апазіцыі ўявіць свае памылкі, яны лічылі нашаю слабасьцю, лічылі вынікам таго, што за імі стаіць уся рабочая кляса. Яны ў гэтым сурова памыляліся.

І толькі пасьля таго, як усе намеры ЦКК вярнуць лідэраў апазіцыі на ленінскі шлях аказаліся дарэмнымі, толькі пасьля таго, як апазіцыя разгарнула сваю фракцыйную працу, якая абярнулася ў працу па арганізацыі новае партыі, толькі пасьля гэтага ЦКК прымушана была ўхваліць вядомую пастанову аб выключэньні з партыі лідэраў апазіцыі.

Камісія, абраная 15-м зьездам, разгледзіць усе матар'ялы, якія датычаць апазіцыі і выкажа вам сваю думку,—гаворыць т. Арджанікідзэ,—мы павінны і можам правесьці зусім бяспадкона. Зьезд павінен ня даць прарваць гэты фронт.

Цэнтральнаю задачаю РСІ застаецца барацьба з бюракратызмам, далейшае палепшаньне апарату і зьнішчэньне яго недахватаў. Да гэтае працы, у адпаведнасьці з заветамі Леніна, павінна быць прыцягнута ўся пізавая грамадзкасьць, усе арганізацыі, пачынаючы ад партыі і канчаючы каапэрацыяй.

Асаблівае ўвагі РСІ, як і раней, патрабуе праверка выкананьня пастаноў партыі. Праблема рацыяналізацыі—вось чарговая галіна задач. Трэба прыцягнуць тэхнічныя сілы з-за граніцы і больш ужываць у сябе дасягненьні заграніччнае тэхнікі. У пляне ЦКК-РСІ намечан склік спэцыяльнае нарады ўсіх працуючых па рацыяналізацыі.

Мала ўвагі—зазначае тав. Арджанікідзэ,—зьвяртаецца на пралетарскую грамадзкую крытыку. Больш крытыкаваць канкрэтных насіцеляў зла,—вось што патрабуецца ад нашае партыйнае і савецкае грамадзкасьці, ад нашае прэсы, якая пераважна займаецца стрэлачніцтвам. Трэба цкаваць бюракратаў, ня спыняючыся перад асобамі. Больш увагі вылучэньству. Больш ходу маладым, таленавітым сілам, якія ў нас часта не выкарыстоўваюцца, заціраюцца.

Зьезд павінен даць нароль на ўвесь край,—канчае свой даклад т. Арджанікідзэ: **«адзіным фронтам проці бюракратызму і скажэньняў»**, і мы даможамся, што гэтае галоўнае зло будзе ў корані зьнішчана (доўгія воплескі).

Заганы нашага апарату і апазіцыя.

У другой частцы свайго дакладу тав. Арджанікідзэ падрабязна разгортвае перад зьездам малюнак працы РСІ і далейшых задач, якія стаяць перад ёю. Дакладчык падае вычэрпваючую характарыстыку дзяржаўнага апарату з пункту гледжаньня тых патрабаваньняў, якія выстаўляў перад ім Уладзімір Ільліч.

Пасьля Кастрычніка пралетарыят прымушаны быў карыстацца ў апараце кіраўніцтва тымі тэхнічнымі і культурнымі сіламі, якія засталіся ў спадчыну ад буржуазеі. Гэтыя людзі прынесьлі з сабою ўсе бюракратычныя замашкі царскае дзяржаўнае машыны. Адгэтуль—адна з прычын бюракратызму ў дзяржаўным апараце. І толькі паступова ўдалося арганізаваць і выхаваць свае кадры.

Які наш апарат у сучасны момант. Бесстаронньі адказ павінен быць такі, што апарат яшчэ далёка не такі, якім яго хацеў бачыць тав. Ленін, але ён у нашых руках і служыць сацыялістычнаму будаўніцтву. Ён яшчэ мае шмат недахватаў. Гэтыя недахваты трэба выпраўляць; але галоўнае ў ім—у наяўнасьці: ён наш.

Апазіцыя ўвесь час вяла кампанію паклёну на наш апарат, называючы яго чужым інтарэсам рабочае клясы. Яна рабіла паклёп на Чырвоную армію, кваліфікуючы яе ледзь ня як тэрмідарыянскую. Які па справе склад нашае Чырвонае армії? Лічбы гаворацъ, што лік рабочых у ёй павялічваецца з кожным годам, з году ў год павялічваецца ў ёй лік партыйцаў. Чыя-ж гэтая армія—чужая, ці нашая? Апазіцыя можа быць спакойнаю: калі Чырвонай армії трэба будзе бараніць сваю сацыялістычную бацькаўшчыну, дык яна здолее гэта зрабіць, як належыць.

Таксама абстаіць і з іншымі часткамі нашага апарату.

Які нацыянальны склад апарату? Шавіністы і іншая антысавецкая публіка мае жаданьне, як вядома, абвінавачваць савецкую ўладу ў культываваньні перавагі тых ці іншых нацыянальнасьцяў у дзяржаўным апараце. Гэта, зразумела, мана. Нацыянальнае разьмеркаваньне служачых у дзяржаўным апараце прапарцыяльна складу жыхарства. Тав. Арджанікідзэ падае лічбы камуністычнага складу савецкага апарату: Наркамгандлю, напрыклад, дае 22 проц., Наркамюст—таксама 22 проц. ВСНГ—20 проц. Менш іншых гэтая лічба ў Наркамземе—14 пр.

Ці апраўдваюць гэтыя лічбы паклёп апазіцыі, што ў складзе нашых савецтаў засілье кулакоў. Не, абсалютна гэта няверна. З лічбаў, пададзеных зьезду, відаць, што саветы складаюцца з беднякоў і сераднякоў.

Недахватаў у нашым апараце даволі шмат і яны значныя. Папершае, апарат вельмі шматлікі, падругое—ён даражы. Ён вельмі цэнтралізаваны, нявыразна працуе. У ім мала разьвіта пачуцьцё адказнасьці. Яго заядае папяровая і іншая валакіта. Прыходзіцца перамагаць вялізныя перашкоды, інэрцыю і коснасьць апарату асобных гаспадарцаў і многіх тысяч чыноўнікаў, якія сядзяць у ім.

Далейшыя задачы.

Чаго мы дамагліся па рэжыме эканоміі, ці дала што небудзь эканомія ў прамысловасьці, гандлі ў адміністрацыйнай галіне і г. д.? Водлуг слоў дакладчыка, ня будзе надта павялічана, ці наадварот надта зьменшана, калі вылічыць усю гэтую эканомію сумаю да 300 міліёнаў руб.

Дырэктыву аб 20 пр. зьніжэньні адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў—гаворыць т. Арджанікідзэ,—мы павінны і можам правесьці зусім бяспадкона. Зьезд павінен ня даць прарваць гэты фронт.

Цэнтральнаю задачаю РСІ застаецца барацьба з бюракратызмам, далейшае палепшаньне апарату і зьнішчэньне яго недахватаў. Да гэтае працы, у адпаведнасьці з заветамі Леніна, павінна быць прыцягнута ўся пізавая грамадзкасьць, усе арганізацыі, пачынаючы ад партыі і канчаючы каапэрацыяй.

Асаблівае ўвагі РСІ, як і раней, патрабуе праверка выкананьня пастаноў партыі. Праблема рацыяналізацыі—вось чарговая галіна задач. Трэба прыцягнуць тэхнічныя сілы з-за граніцы і больш ужываць у сябе дасягненьні заграніччнае тэхнікі. У пляне ЦКК-РСІ намечан склік спэцыяльнае нарады ўсіх працуючых па рацыяналізацыі.

Мала ўвагі—зазначае тав. Арджанікідзэ,—зьвяртаецца на пралетарскую грамадзкую крытыку. Больш крытыкаваць канкрэтных насіцеляў зла,—вось што патрабуецца ад нашае партыйнае і савецкае грамадзкасьці, ад нашае прэсы, якая пераважна займаецца стрэлачніцтвам. Трэба цкаваць бюракратаў, ня спыняючыся перад асобамі. Больш увагі вылучэньству. Больш ходу маладым, таленавітым сілам, якія ў нас часта не выкарыстоўваюцца, заціраюцца.

Зьезд павінен даць нароль на ўвесь край,—канчае свой даклад т. Арджанікідзэ: **«адзіным фронтам проці бюракратызму і скажэньняў»**, і мы даможамся, што гэтае галоўнае зло будзе ў корані зьнішчана (доўгія воплескі).

Ліга Нацый на варожай Літве пазіцыі.

ПОЛЬСКА-ЛІТОЎСКІ КАНФЛІКТ НА АБГАВОРЫ СЭСІІ ЛІГІ.

Нажым на Літву ў Жэневе.

ЖЭНЕВА, 7-XII. Штрэзэман прыняў нямецкіх журналістаў, якім заявіў, што **вялікія дзяржавы прышлі між сабою да згоды, прапанаваўшы Літве зрабіць дэклярацыю аб спыненьні стану вайны з Польшчаю і аднавіць з ёю паштовую сувязь і гандлёвыя зносіны.** Што датычыць дыпляматычных і консульскіх зносін, дык аднаўленьне іх не прапануецца Літве.

Заява Літвы паконт Вільні, згодна пастановы вялікіх дзяржаў, павінна быць узята радаю Лігаю Нацый да ведама, але ня будзе ўзята да ведама Польшчаю. Пытаньне аб кантрольнай камісіі, якую мяркуецца паслаць на польска-літоўскую мяжу на першы пэрыяд пасьля спыненьня стану вайны між Літвою і Польшчаю, высоўваецца Нямеччынаю, але яшчэ ня вырашана канчаткова.

Выступленьне Вальдэмараса на сэсіі Лігі.

ЖЭНЕВА, 7-XII. На дзённым пасяджэньні рады Лігі Нацый выступаў Вальдэмарас з матывоўкаю літоўскае скаргі. Прамова Вальдэмараса была спакойнаю, вытрыманаю і пераконваючаю.

У канцы прамовы Вальдэмарас патрабаваў, каб Ліга Нацый пазначыла камісію для абсьледваньня апошніх зьмен у пагрупоўцы войска, як у Польшчы, так і ў Літве, а таксама для спыненьня арганізацыі на польскай тэрыторыі варожых Літве банд і ўтварэньня камісіі для абсьледваньня рэпрэсій, якія церпіць літоўскае жыхарства Віленшчыны.

Мэмарандум Залескага.

ЖЭНЕВА, 11-XII. Выступаючы з адказам Вальдэмарасу, Залес і зачытаў вялікі мэмарандум. Пакідаючы без адказу абвінавачаньні Вальдэмараса, мэмарандум Залескага перачічвае спробы Польшчы, пачынаючы з 1919 г., дамовіцца з Літвою. Усе гэтыя спробы, водлуг слоў мэмарандуму, наўхільна канчаліся наўдачаю, з прычыны непаладзьня Літвы дамовіцца. У выніку,—яна кажа Залескі,—стварылася становішча, на і ўвесь басэйн Нёману адарваны ад натуральнага выхаду ў мора, яшчэ зьяўляецца для яго Мэмель, а апошні ў свой чарод запепадае эканамічна з-за памянёнае палітыкі літоўскага ўраду.

Вялікую зацікаўленасьць выклікала тая частка прамовы Зэлескага, дзе ён зазначаў на цяжкае становішча Мэмелю і заявіў літаральна так: „У гэтых умовах дзяржавы маглі-б паставіць сабе запытаньне, ці не дапусьцілі яны памылкі, аддаўшы Літве Мэмельскі порт, якім яна так дрэнна карыстаецца».

Далей Залескі зазначыў, што нельга цешыць сябе тым, што стан вайны між Польшчаю і Літвою вызначаецца, як фіктыўны, бо „грукату гарматаў яшчэ ня чуваць". Калі гарматы загрукаюць, дык будзе ўжо вельмі позна.

Залескі заяўляе, што калі на будзе знойдзены шлях да канчатковага вырашэньня пытаньня перавагі тых ці іншых нацыянальнасьцяў у дзяржаўным апараце. Гэта, зразумела, мана. Нацыянальнае разьмеркаваньне служачых у дзяржаўным апараце прапарцыяльна складу жыхарства. Тав. Арджанікідзэ падае лічбы камуністычнага складу савецкага апарату: Наркамгандлю, напрыклад, дае 22 проц., Наркамюст—таксама 22 проц. ВСНГ—20 проц. Менш іншых гэтая лічба ў Наркамземе—14 пр.

Ці апраўдваюць гэтыя лічбы паклёп апазіцыі, што ў складзе нашых савецтаў засілье кулакоў. Не, абсалютна гэта няверна. З лічбаў, пададзеных зьезду, відаць, што саветы складаюцца з беднякоў і сераднякоў.

Недахватаў у нашым апараце даволі шмат і яны значныя. Папершае, апарат вельмі шматлікі, падругое—ён даражы. Ён вельмі цэнтралізаваны, нявыразна працуе. У ім мала разьвіта пачуцьцё адказнасьці. Яго заядае папяровая і іншая валакіта. Прыходзіцца перамагаць вялізныя перашкоды, інэрцыю і коснасьць апарату асобных гаспадарцаў і многіх тысяч чыноўнікаў, якія сядзяць у ім.

Далейшыя задачы.

Чаго мы дамагліся па рэжыме эканоміі, ці дала што небудзь эканомія ў прамысловасьці, гандлі ў адміністрацыйнай галіне і г. д.? Водлуг слоў дакладчыка, ня будзе надта павялічана, ці наадварот надта зьменшана, калі вылічыць усю гэтую эканомію сумаю да 300 міліёнаў руб.

Дырэктыву аб 20 пр. зьніжэньні адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў—гаворыць т. Арджанікідзэ,—мы павінны і можам правесьці зусім бяспадкона. Зьезд павінен ня даць прарваць гэты фронт.

Цэнтральнаю задачаю РСІ застаецца барацьба з бюракратызмам, далейшае палепшаньне апарату і зьнішчэньне яго недахватаў. Да гэтае працы, у адпаведнасьці з заветамі Леніна, павінна быць прыцягнута ўся пізавая грамадзкасьць, усе арганізацыі, пачынаючы ад партыі і канчаючы каапэрацыяй.

Асаблівае ўвагі РСІ, як і раней, патрабуе праверка выкананьня пастаноў партыі. Праблема рацыяналізацыі—вось чарговая галіна задач. Трэба прыцягнуць тэхнічныя сілы з-за граніцы і больш ужываць у сябе дасягненьні заграніччнае тэхнікі. У пляне ЦКК-РСІ намечан склік спэцыяльнае нарады ўсіх працуючых па рацыяналізацыі.

Мала ўвагі—зазначае тав. Арджанікідзэ,—зьвяртаецца на пралетарскую грамадзкую крытыку. Больш крытыкаваць канкрэтных насіцеляў зла,—вось што патрабуецца ад нашае партыйнае і савецкае грамадзкасьці, ад нашае прэсы, якая пераважна займаецца стрэлачніцтвам. Трэба цкаваць бюракратаў, ня спыняючыся перад асобамі. Больш увагі вылучэньству. Больш ходу маладым, таленавітым сілам, якія ў нас часта не выкарыстоўваюцца, заціраюцца.

Зьезд павінен даць нароль на ўвесь край,—канчае свой даклад т. Арджанікідзэ: **«адзіным фронтам проці бюракратызму і скажэньняў»**, і мы даможамся, што гэтае галоўнае зло будзе ў корані зьнішчана (доўгія воплескі).

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1-й гад. уночы).

ВЫКЛЮЧЭНЬНЕ АПАЗІЦЫЯНЭРАЎ З ПАРТЫІ.

ЗАПАРОЖЖА, 8-XII. Акруговая кантрольная камісія, разгледзіўшы справу групы апазіцыянэраў, наладжваўшых падпольныя нарады, на якіх абмяркоўвалі плян фракцыйнай працы, і прыняўшых удзел у нарадзе, скліканай у зьвязку з прыездам Ракоўскага, выключыла з партыі пяць чалавек.

ЛІТВА І ЖЭНЕВА.

Зноў Літва, зноў Жэнева. Гэтыя два пункты штодзень друкуюцца ў газэтах, штодзень абгаварваюцца палітычнымі дзеячамі. Перад гэтаю «злабою» адыходзяць на другі плян усе іншыя зьвобы дню. Што-ж новага далі нам гэтыя дні.

Польшча ня толькі ня спыніцца брацкаць зброяю, але трымае сябе проста выклікаюча, зусім не зьвяртаючы ўвагі на надыходзячую сэсію Лігі Нацый, якая павінна вырашыць польска-літоўскі канфлікт. Польская ваеншчына пагражае Літве зусім адкрыта.

«Зараз Літва яшчэ пратэстуе супроць аб'яднаньня з Польшчаю. Але ў хуткім часе пакіне пратэставаць»,—так піша орган польскага вайсковага міністэрства «Польска Збройна».

Сказана вельмі нядвохзначна. Але яшчэ больш ясна выказваецца другая польская газэта—«Кур'ер Польскі». Гэта газэта піша наступнае:

«Калі савет Лігі ня вынесе ўхвалеваі аднагалосна пастановы, Польшча будзе мець права ўжыць самастойныя захады супроць Літвы, аж да абвяшчэньня вайны».

Поруч з гэтым на польска-літоўскай мяжы ўзмацняецца польскае прыгранічнае войска і ўсімі мерамі падтрымліваюцца выпады літоўскай эміграцыі. Становішча, як відаць з гэтых фактаў, вельмі напружанае.

Якія-ж вывады робіць з яго «ратаўнічая» Ліга Нацый?

«Разгляд скаргі Літвы будзе, праўдападобна, перададзены камісіі», —так паведамляе тэлеграма з Жэневы. А пытаньні польска-літоўскіх узаемаадносін будзе разглядаць уся сэсія Лігі Нацый. Бяручы пад увагу, што Пілсудскі і польскі друк загадзя заяўляюць аб тым, што яны будуць лічыцца з пастановамі Лігі Нацый настолькі-наколькі, —лёгка прадбачыць, што якую-б пастанову Ліга не ўхваліла, яна застанецца простым кавалкам паперы. І калі Польшча пэ арганізуе зараз-жа нападу на Літву, дык у кожным выпадку не таму, што Ліга Нацый ёй гэта забароніць, а з прычыны грозпай небясьпекі, якую гэткі напад стварыў бы для самой Польшчы.

Але можна быць упэўненым, што пастанова Лігі Нацый будзе ў значна большай ступені бараніць інтарэсы Польшчы, чым Літвы. Гэтая «паважная» ўстанова ўхваляе толькі тыя пастановы, якія дыктуюць ёй моцныя імпэрыялістычныя дзяржавы, а за Польшчаю-ж стаіць драпежны ангельскі імпэрыялізм, які хоча мець моцную Польшчу, як аплот супроць СССР.

Якія-б высокаўрачыстыя размовы ў Жэневе не вяліся, яны заўсёды застануцца пустымі размовамі. Гэта вельмі яскрава відаць з толькі што скончанай папярэдняй камісіі па разброеньні. Адзінай дэлегацыяй, якая запрапанавала практычны плян разброеньня, была савецкая дэлегацыя. Згадзіцца з гэтымі прапановамі імпэрыялістскія гаспадары Лігі Нацый, зразумела, не маглі. Ды ніводная з капіталістычных дзяржаў і ня думае ўсур'ёз аб разброеньні. А калі думое, дык аб разбоеньні сваіх ворагаў.

Вось чаму савецкія прапановы, зусім ясныя і выразныя, нават не абмяркоўваліся, як «нерэальныя», і выклікалі шалёную злосьць усяго буржуазнага друку. Але гэтыя прапановы ўсё ткі прагучэлі на ўвесь сьвет, і замазаць іх няма ніякай магчымасьці. З гэтых прапаноў працоўныя ўсяго сьвету змогуць пераканацца, што СССР сапраўды змагаецца за мір і што Ліга Нацый, гэта—установа, пад прыкрыцьцем якой рыхтуюцца новыя войны.

Ліга бясьсільна зьліквідаваць літоўска-польскую стычку, як і ўсе іншыя стычкі. Яна ня можа зрабіць ніводнага кроку па шляху сапраўднага разброеньня. Толькі на абломках капіталістычных дзяржаў з іх спосабамі маны, накшталт Лігі Нацый, можа быць заснаваны сапраўдны мір паміж народамі.

О. Л.

АЦЭНКА СПАТКАНЬНЯ ЛІТВІНАВА З ЧЭМБЭРЛЕНАМ

Ангельская грамадзкасьць чакае англа-савецкага паразуменьня.

ЛЁНДАН, 6-12. Абмяркоўваючы спатканьне Літвінава з Чэмбэрленам, «Дэйлі Тэлеграф» піша: «Надзеі знайсьці базу для англа-расейскае згоды ня мелі ніякіх посьпехаў, з прычыны ўпартасьці, з якою Літвінаў дамагаўся того, каб савецкі ўрад ня мог лічыцца адказным за Камінтэрн».

«Дэйлі Ньюс» (лібэральная) піша: «Далейшыя перамовы між Англіяй і СССР як відаць няўхільны. Бязглузьдзіцца разрыву з СССР была даказана ня раз. Гэта прызнана дзелавымі коламі, а прыватным чынам гэта было прызнана і не адным з членаў ураду. Гэткага роду прызнаньне было зроблена публічна, у прамове прэм'ера ў Гільдхолі».

„Манчэстэр Гардыян" востра крытыкуе палітыку ангельскага ўраду ў адносінах да СССР і падкрэсьлівае: «Цяжкае становішча Чэмбэрлена ў тым, што ён ня можа падпісаць новую згоду з СССР, ня прызнаўшы, што разрыў быў памылкаю».

* * *

ЛЁНДАН, 6-12. Наконт спатканьня Літвінава з Чэмбэрленам «Дэйлі Геральд» піша так: «Абодвы ўрады ўхваляюць формулу ўзаемнага няўмешваньня; далейшым крокам павінна быць спроба дасягнуць згоды наконт зьместу і тлумачэньня гэтае формулы».

Паглыбленьне палітычнага крызісу ў Румыніі.

ВЕНА, 5-XII. Як паведамляюць з Бухарэсту, румынскі прэм'ер Вінтыл Братыяну водлуг запатрабаваньня нацыянальнае сялянскае партыі перадаў апошняй прапанову лібэральнае партыі аб заснаваньні кааліцыйнага ўраду. У прапанове зазначаецца, што лібэральная партыя лічыць становішча надзвычайна сур'ёзным і знаходзіць неабходным згоду з другою па велічыні палітычнаю партыяю ў Румыніі на пэўных падставах.

3-га сьнежня адбылася нарада выканкому нацыянальнае сялянскае партыі, на якой прапановы лібэралаў былі канчаткова адхілены.

Нямецкія камунары ганьбяць рэнэгатаў.

БЭРЛІН, 3-12. Канфарэнцыя акруговае арганізацыі кампартыі ў Кёрлсруэ самым суровым чынам запляміла дзейнасьць групы Рут-Фішэр і падкрэсьліла сваю згоду з ужытымі проці Троцкага і Зіноўева мерамі. Два дэлегаты-апазіцыянэры, выступаўшыя ў спрэчках, таксама заявілі, што згодны з пастановамі акруговага камітэту. Усе пададзеныя на канфэрэнцыі прапановы былі ўхвалены аднагодна.

Барацьба плыняў на нарвэскім прафзьезьдзе.

ОСЛО, 7-XII. З 237 дэлегатаў, прысутных на зьезьдзе нарвэскіх прафсаюзаў, камуністаў—63, прыхільнікаў Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу—70, рэшта — транмэлісты. Барацьба на зьезьдзе набыла досыць востры характар і распачалася з выбараў мандатнае камісіі. Перамога правага крыла распэньваецца, як выпадковая. Сэкратарыят ня мае цьвёрдае большасьці.

У спрэчках па справаздачы сэкратарыяту крытыкавалася яго тактыка і ганьбілася яго дзейнасьць.

Барацьба на зьезьдзе між Транмэлем і сэкратарыятам зьяўляецца адбіткам барацьбы між правым і левым крылом рабочае партыі. Гэтая барацьба абвастрылася пасьля выбараў у парлямант, калі рабочая партыя атрымала 60 месц, з прычыны чаго ле фракцыя ў парлямандзе зьяўляецца самаю шматлікаю. З гэтае прычыны правыя дамагаюцца ўтварыць урад рабочае партыі пры падтрыманьні лібэралаў, але левыя на чале з Транмэлем—проці ўтварэньня ўраду па ўзору макдональдаўскага.

Прамова прадстаўніка УЦСПС Яўрэінава, крыху нязвычайная для прывітаньня, з пастаноўкаю вострых пытаньняў пафруху, была заслухана з вялікаю цікавасьцю.

У зьвязку з 10-мі ўгодкамі прыдушэньня пралетарскае рэвалюцыі ў Фінляндыі зьезд зьвярнуўся да аб'яднаньня фінскіх прафсаюзаў з тэлеграмаю, у якой выказвае сваю салідарнасьць з рэвалюцыйнаю барацьбою пралетарыяту Фінляндыі, а таксама спачуваньне наконт страчаных ахвяр. Гэты зварот мае для Скандынавіі палітычнае значэньне, бо гэты дзень фінская сацыял-дэмакратыя сьвяткуе разам з буржуазеяй.

ЯЎРЭЙСКІЯ ПАГРОМЫ У РУМЫНІІ.

ПАГРОМЫ СПРАВАКАВАНЫ ЎРАДАМ?

ВЕНА, 7-12. Вэнгерскія газэты паведамляюць, што ў зьвязку з адчыненьнем 4-га сьнежня ўсярумынскага зьезду нацыяналістычнага студэнцкага саюзу, у прыгранічным горадзе Сямігрэдзьдзя Арадэа адбыліся дэманстрацыі проці яўрэяў і вэнграў. Дэманстрацыі скончыліся крывавымі эксцэсамі.

Апазіцыйныя румынскія колы лічаць, што пагромы ў Арадэа і Арадэ і ў гэты раз справакаваны ўрадам, які такім парадкам імкнецца стварыць прычыну для новых рэпрэсій проці апазіцыі і асабліва проці рабочага руху.

Забіта 8 чалавек.

ВЕНА, 7 12. Водлуг апошніх паведамленьняў з Румыніі, у часе пагрому ў Арадэа Марэ і Арадэ забіта 8 чалавек. Завярэньне афіцыёзнага румынскага агенцтва „Радор", нібы непарадкі справакаваны камуністамі, венгерскія газэты называюць „сьмехатворнымі спробамі прыкрыць сапраўднае становішча рэчаў".

Зьезд фашысцкага студэнцтва.

Процантная норма для яўрэяў.

ВЕНА, 7-XII. На зьезд румынскіх нацыянальных студэнцкіх саюзаў у Арадэа-Марэ прыехала ў агульным ліку звыш 5 тысяч студэнтаў, у большасьці ўзброеных. Зьезд будзе абмяркоўваць пытаньне **АБ УВЯДЗЕНЬНІ ЦРОЦАНТНАЕ НОРМЫ ДЛЯ ЯЎРЕЯЎ** у вышэйшых навучальных установах Румыніі і ва ўсіх галінах разумовае працы.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

ВОЛЬНЫЯ СЛУХАЧЫ.

Міністэрства асьветы выдала загад каб віленскі унівэрсытэт прымаў скончыўшых віленскую беларускую гімназію на правох вольных слухачоў.

Так скончыліся хадайніцтвы ўсіх беларускіх гімназій у Польшчы, каб іх абітурыентаў прымалі ва ўсе польскія унівэрсытэты на правох студэнтаў.

ППС і Вызваленьне.

Перагаворы між ППС і Вызваленьнем аб утварэньні выбарчага блёку, якія вяліся апошнімі днямі з посьпехам, урэшце наткнуліся на перашкоды пры абгаварваньні пытаньняў аб мясцох на супольных сьпісках. Як аказваецца, пэпэсы вымагаюць для сябе шмат месц, на

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

6-ЦІМЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ БЕЛАРУСАЗНАЎСТВА.

Гомель. На арганізацыю курсаў беларусазнаўства ў Гомельшчыне па бюджэту адпускаецца 10.000 р. Курсы сваёй мэтай ставяць задачу даць магчымасьць працаўніком акруговых і раённых установ вывучыць тэарэтычна і практычна беларускую мову, а таксама азнаёміць з гісторыяй і геаграфіяй Беларусі.

У праграме курсаў вызначана 90 гадзін на беларускую мову, 20—на гісторыю Беларусі і 34 гадзіны на геаграфію. Тэрмін навучаньня разлічаны на 6 месяцаў. Мяркуецца арганізаваць у горадзе 10 груп і па адной групе ў кожным раённым цэнтры. Праца курсаў, згодна дырэктыў Галоўпалітасьветы, распачнецца з 1-га лістапада 1928 г.

ПРАЦА ДЭМАБІЛІЗАВАНЫМ.

Гомель, 8-XII. Біржа працы паведаміла на працу 200 дэмабілізаваных чырвонаармейцаў на пастаянныя месцы. 223 чал. атрымліваюць часовую працу. На вучоце засталося 190 чал., з іх 100 чал. жывуць у вёсцы.

РАЙЁННЫЯ СХОДЫ СЕЛЬКОРАЎ.

Магілеў, 8-XII. На працягу сьнежня рэдакцыя акруговай газэты правядзе селькораўскія сходы ў Пранойскім, Крычаўскім, Кармянскім і Касьцюкоўскім раёнах. Гэтыя сходы навінны дадуць садзейнічаць палепшаньню работы селькораўскай працы і даць напрамак на зімовы перыяд.

ГОСТ ПЧАЛЯРСКІХ ГАСПАДАРАК.

Пчалярскія гаспадаркі ў БССР паляроюцца з кожным годам.

Зараз у БССР больш 50,000 пчалярскіх гаспадарак, якія маюць звыш 74,000 сем'яў пчол.

ПАЛЕПШАНЬНЕ СУДАХОДСТВА НА ДЗЬВІНЕ.

Віцебск, 8-12. У навігацыі бягучага году на р. Дзьвіне быў праведзены шэраг значных работ для палепшаньня судаходзтва. Землячарпалка ў 15 розных мясцох выняла 3079 куб. мэтраў зямлі і 1600 куб. мэтр. каменьняў. Дзякуючы гэтым работам русло ракі ўглублена і ачышчана ад каменьняў, што значна палепшыла ўмовы судаходзтва.

АДЧЫНЯЕЦЦА ШКОЛА ФАБЗАВУЧА.

Віцебск, 8-12. З першага студзеня 1928 г. адчыняецца школа фабрычна-заводзкага вучнёўства, якая будзе працаваць пры заводах «Мстпром» і «Чырвоны мэталіст». Гэтая школа ахопіць усю брань падлеткаў абодвых заводаў.

ПЕРАВЫБАРНЫ СХОД ПРАЙШОЎ АКТЫЎНА.

Ветрын, 8-XII. На перавыбарчы сход спажывецкай каапэрацыі зьявілася каля 70 проц. усіх пайшчыкаў і каля 100 чалавек некаапэраванага насельніцтва. Сход прайшоў вельмі актыўна. Склад новага праўленьня абноўлены на 2/3, а камісіі на ўсе 100 проц. Сход вызначыў 10 проц. з прыбытку на каапэраваньне беднаты і 52 руб. на набудову самалёту імя «Спажыўкаапэрацыі»

БУДУЕЦЦА НОВЫ МОСТ.

Хольч, 7-XII. 5 сьнежня у м. Хольч пачалася праца па будове маста праз р. Сож. Пакуль на працы занята 40 чал., але ў далейшым іх лік будзе даведзены да 100 чал. На працягу зімы намечана скончыць забіўку слупоў. Вясной пачнуцца земляныя работы на будове дамбы і тады лік рабочых павялічыцца ў два разы.

На варце краіны Саветаў.

ПЕРШЫЯ ДНІ ВУЧОБЫ.

(Зьмітравіцкі вучпункт, Бярэзінск. р.)

Раніца. Нібы воўчыя вочы праз вокны хат бліпчаць агоньчыкі. Прапелі апошнія пеўні, пачало віднець. Жанчыны даўно ўжо ня сьпяць, а каля прыпечкаў прадуць кудзелю. Дапрызыўнікі яшчэ сьпяць—хто на ложку, хто на лаўцы, а некаторыя нават і ва печ забраліся. Глянуўшы ў вакно, Агапа хутка саскочыла з прасьніцы і, ківуўшы верацяно на прыпечак, пачала будзіць:

— Сьцяпан, а Сьцяпан, уставай! Вунь ужо дапрызыўнікі пастроіліся на прагулку.

Луппуўшы вачыма, Сьцяпан хутка ўстаў, нацягнуў боты і, узяўшы над пахну шапку, хутка набег. Толькі дапрызыўнікі напарадку разьлічылася як і Сьцяпан прыбег засопшыся, выцягнуўшыся, ён голасна сказаў:

— Тав. камандзір, дазвольце мне ў строй стаць

— А дзе вы былі, чаму спазьніліся?

— Я... Я заспаў крыху т. камандзір—зачырванеўшыся адказаў Сьцяпан.

— Ну глядзі—кажа камандзір—каб гэта быў першы і апошні раз. Становіся на левы флянг. На права! На чатыры стройся. Шагам арш. Толькі сьнег шуршыць пад нагамі, ды вочы скрозь вокны сустракаюць і ласкава праводзяць будучых абаронцаў нашай краіны.

Скончылася прагулка і дапрызыўнікі сслі на палітгадзіну. Памяшканьне абсталёвана добра і ўпаўне спрыяе тэаратычным заняткам. Усе дапрызыўнікі разьбіты на дзьве групы на 50 чалавек у кожнай. Грунаводы ставяць пытаньні, якія закранаюць першыя дні вучобы—аб неабходнасьці сур'ёзнай вучобы, дысцыпліны і г. д.

Дапрызыўнікі даюць адказы, але пакуль што няўпэўнена, бо крыху запамяталі за год. Першая тэма была: парадак адбываньня вайсковай службы. Тэмай зацікавіліся аб чым, сьведчыць тое, што многія запісваюць лічбы і вывады. Палітгадзіна скончылася. Перапынак. Зноў страявыя заняткі са стрэльбай. Вячэра, а потым пазашкольная праца.

Першыя дні вучобы падкрэсьлілі што ахвота да вучобы ёсьць. Скаргаў як на вучобу, так і на іншыя ўмовы няма. Арганізавалі ўжо два гурткі—вайскораўскі і вайсковы, а таксама 9 чал. падпісалася на газэту «На страже». Так штодзённай працай мы падрыхтоўваем будучых чырвонаармейцаў.

Б. Ч.

БОЛЬШ УВАГІ ВАЕНІЗАЦЫІ.

(Ст. Менск, МБВ чыг.).

На вузьле ст. Менск МБВ чыг. працуе каля 2000 рабочых і служачых, між тым справа ваенізацыі пастаўлена ня сусім добра.

Усяго толькі пры клюбе «памяти Ильича, маецца 2 вайсковыя гурткі: адзін на стральбе з вінтоўкі, а другі—кулямётны, у якіх налічваецца каля 70 чал., пераважна дарослых рабочых. Заняткі ў гурткох праводзяцца пры данамозе спэцыяльных кіраўнікоў з Дому Чырвонай арміі.

Тормазам у працы гурткоў зьяўляецца адсутнасьць вайсковых прыладаў, якія неабходны для заняткаў і вінтоўкі.

У далейшым чыгуначнікам трэба зьвярнуць большую ўвагу на ўцягненьне рабочых у практычную працу па вывучэньні вайсковай справы. **Я.**

МЕНСКІ ДАПРЫЗПУНКТ ЗА ПРАЦАЙ

Яўка і пачатак вучобы.

Першым дасягненьнем сёлетняга збору дапрызыўнікаў 1906 году трэба лічыць поўную 100 проц. яўку і сур'ёзныя адносіны моладзі да вайскова-палітычнай вучобы. Ня гледзячы на ня зусім добрыя ўмовы для працы самога памяшканьня вучпункту,—усё-ж заняткі пачаліся своячасова, па намечаным раней пляну і праграме.

Стралковыя заняткі.

Увесь дапрызыўны пункт будзе вывучаць тып войск—пяхоту: на стралковай справе, страявой—тактычнай, вывучэньне уставаў службы і інш.

На працягу ўсяго часу вучобы адбудзецца 3 стральбы. Першая стральба будзе 10-га сьнежня. Каб не адарваць ад вучобы студэнтаў рабфаку, тэхнікумаў і інш. навучальных устаноў, для іх арганізованы асобныя групы з добра прыстасованай праграмай.

Дысцыпліна.

З першых дзён заняткаў сярод дапрызыўнікаў наглядаліся выпадкі нядысцыплінаванасьці. Цяпер дысцыпліна наладжана. Таксама былі некаторыя выпадкі сымуляцыі, за якую вінаўныя прыцягваюцца да адказнасьці.

Палітгадзіна.

Актыўнасьць у палітзанятках адчуваецца досыць добрая, але не дапрызыўнікам няма магчымасьці правяць таму, што дужа вялікія групы. На гэту справу ўжо зьвернута ўвага і палітзаняткі будуць поўнасьцю забясьпечаны грунаводамі.

Масавая праца.

Пазашкольная масавая праца яшчэ добра не наладжана, але ўсё-ж з кожным днём паступова разгортваецца. Масавая праца галоўным чынам будзе праводзіцца ў ленкутку, дзе будуць праводзіцца даклады, лекцыі, стральба з драбінак, выпуск насьценных газэт. Газэт для пункту выпісьваецца 83 экз. і 2 часопісі.

Камсамольцы, якія складаюць значную частку пункту, павінны стаць ініцыятарамі ўсёй масавай працы і прыцягнуць да актыўнага ўдзелу беспартыйную моладзь.

Харчаваньне.

Рабочыя і служачыя, за якімі не захоўваецца зарплата, а таксама беспрацоўныя залічаны на харчаваньне за кошт дзяржавы,—у ліку прыблізна 30—35 проц. усяго складу дапрызыўнікаў. Харчаваньнем дапрызыўнікі здаволены. **Я. Зб.**

Аб вакацыях у школах.

У пытаньні аб вакацыях патрэбна разглядаць два бакі. Першы, як адпачынак вучняў і настаўнікаў; другі, як падвядзеньне вынікаў працы. А таму вельмі неабходна ўстанавіць час вакацыяў назаўсёды. Цяпер раздаюцца галасы супроць прынятых Наркамасьветы Беларусі зімніх вакацыяў з 25-I—16-II, маецца імкненьне перанесьці іх на канчатак сьнежня і пачатак студзеня. Тут, бязумоўна, адчуваецца традыцыя гэтак зв. «сьвяточных канікул», якія супадаюць з рэлігійнымі сьвятамі, нават не на глебе рэлігійнай, а проста на звычаю, матывіруючы тымі педагагічнымі перкаваньнямі, што патрэбен двохратовы адпачынак вучням. Я лічу, што адпачынак патрэбен ня двохратовы, а трохратовы і трэба прыстасоўваць яго да сваіх рэвалюцыйных сьвят. Трэба заўважыць, што нашы рэвалюцыйныя сьвяты вельмі сутамляюць дзяцей і застаўляюць у іх слабае ўражаньне.

Калі ўспамінаеш вучнёўскія гады, прыходзіцца сказаць, што сьвята тым і ўразаецца ў памяць і сэрца, што свабодзен ад звычайных заняткаў і думак, ад звычайных абставін.

Самы адпачынак нашым дзецям асабліва патрэбен, бо яны знаходзяцца ў цесных антыгігіенічных памяшканьнях з трохзьменнымі заняткамі. А таму, пачынаючы заняткі ў гарадзкой школе з 15 жніўня, першы адпачынак будзе кастрычніцкавыя вакацыі з 3--13 лістапада, на дзесяць дзён. Другі перапынак на 20 дзён—з 20 студзеня па 10 марта—ленінскія, ці январскія вакацыі. Трэція вакацыі першамайскія—з 28 сакавіка па 7 мая, на дзесяць дзён. Сэнс апошніх вакацыяў у вясеньнія дні сам на сабе зразумелы.

Ня гледзячы на тое, што ў прынятай пастанове Наркамасьветы аб зімовых канікулах маюцца недахопы з пункту гледжаньня пэдагагічнага і прафэсыйнага, усё-ж яе трэба прызнаць пажаданай. Пачын зроблен правільны, толькі неабходна ўдакладніць, каб ва ўсіх установах вакацыі былі адначасова і ўвесьці кастрычнікавыя і першамайскія вакацыі. Я лічу, што гэта ёсьць першая проба на шляху ўвядзеньня мэтазгодных пэдагагічных і рэвалюцыйных школьных адпачынкаў, па якому павінна будзе ісьці і астатняя СССР. Настаўнік **Т. Зарубін.**

Скарыстоўваем вайсковых спэцыялістаў.

(Вобальскі с-с., Полаччына)

Пры Вобальскай ШСМ ужо чацьвёрты год існуе гурток фізкультурнікаў і па вывучэньню вайсковай справы.

Дзякуючы актыўнасьці вучняў і сялян-камсамольцаў, а таксама і беспартыйных, справа наладжана добра.

Апроч звычайных заняткаў па вывучэньню вайсковай справы, якія праводзяцца рэгулярна, мы скарыстоўваем розных вайсковых спэцыялістаў.

Прыедзе, напр., у водпуск лётнік—яго просяць правесьці гутарку аб авіяцыі; прыедзе чырвоны камандзір—просяць яго правесьці заняткі і г. д. Наогул—зацікаўленасьць вялікая, а таму і посьпехі зроблены значныя.

Хлапцы ведаюць строй, вывучылі вінтоўку, вучацца страляць (маюць вінтоўку), добра ўяўляюць жыцьцё арміі.

Такі мэтад выкарыстаньня розных спэцаў, якія выпадкова на вядомы час наведваюць дадзены райён, можна ўжываць кожнаму. Галоўнае—ініцыятыва.

А. М-кі.

Будзем вывучаць вайсковую справу.

(Пясочна, Капыльскага райёну).

У Пясочным ячэйка ТДА-Авіяхіму існуе даўно, але праца да апошняга часу амаль што зусім не вялася. 17-га верасьня былі праведзены выбары новага бюро, якое прыступіла да свае працы. Перш за ўсё паладзілі вучот усіх сяброў, бо да таго часу яго ня было.

Таксама бюро ячэйкі ліквідавала запазычанасьць сяброўскіх узносаў і завербавала некалькі новых сяброў. Такім чынам, зараз у ячэйцы масцца 37 сяброў, большасьць якіх складаюць служачыя, і маецца каля 50 прыхільнікаў таварыства, большасьць вучні сямёхгодкі. Ячэйка арганізавала два гурткі: вайсковы і санітарны, але трэба сказаць, што гурткі да гэтага часу амаль не пачыналі працы. Бюро ячэйкі склікала сход, дзе гэтыя пытаньні абгаварылі, выбралі новага кіраўніка вайсковага гуртка і далі наказ, каб гурткі хутчэй пачалі сваю працу. **Вясковы.**

Гэтак не навінна быць.

(Ячэйка ТДА-Авіяхіму заводу „Энэргія").

Нядаўна Менскі акруговы Савет ТДА-Авіяхіму абсьледваў становішча ячэйкі ТДА-Авіяхіму завода „Энэргія". Мэтай гэтага абсьледваньня было выявіць як працуе ячэйка на вялікім заводзе «Энэргія». Што-ж паказала гэтае абсьледваньне?

Апошняе паказала, што праца ячэйкі пастаўлена слаба: сяброўскія ўзносы на зьбіраюцца, гурткі вайсковых ведаў няма авіяхім каманда не працуе. І гэта ня гледзячы на тое, што мясцком заводу «Энэргія» зацікаўлен у разгортваньні працы ячэйкі? Апошні штомесячна адпускае ячэйцы з сваіх сродкаў 20 р. Але гэтыя грошы ляжаць і марнуюцца.

Праўда, шырокаму разгортваньню працы ячэйкі ТДА-Авіяхіму на заводзе перашкаджае адсутнасьць памяшканьня для вайсковага кутка. Але ці так павінна быць? Ні ў якім разе.

Мясцкому і парт'ячэйцы трэба падумаць аб гэтым і якнайхутчэй наладзіць працу ячэйкі на заводзе.

М. А--скі.

ВЕСТКІ ТДА-АВІЯХІМУ.

«НА БОЕВОМ ПОСТУ».

Пад гэткай назвай 3 сьнежня ў Маскве выпушчана ў продаж бібліятэчка ТДА-Авіяхіму.

Бібліятэчка складаецца з 86 асобных брашур, агульнай каштоўнасьцю 13 рублёў. У склад бібліятэчкі ўваходзяць кнігі і брашуры на ўсіх пытаньнях ваеннай і ТДА-Авіяхімаўскай працы. Бібліятэчка разьлічана для аказаньня практычнай дапамогі вайсковым гурткам і ячэйкам у іх працы.

ПРАГРАМА ДЛЯ ГУРТКОЎ ВАЙСКОВЫХ ВЕДАЎ.

На апошнім пасяджэньні цэнтральнай сэкцыі (Масква) па вайсковай падрыхтоўцы працоўных былі канчаткова зацьверджаны праграмы для гурткоў вайсковых ведаў.

Праграмы ўжо здадзены ў друк і ў бліжэйшыя дні будуць разасланы ва месцы.

КУРСЫ ПА БАРАЦЬБЕ СА ШКОДНІКАМІ.

У Днепрапятроўскай акрузе ТДА-Авіяхім праводзіць шасьць трохзьбінных курсаў для членаў ТДА-Авіяхіму па барацьбе з садовымі, палявымі і хатнімі шкоднікамі.

СЯЛЯНСКІЯ КАМАНДЫ ПЕРШАЙ ДАПАМОГІ.

У в. Броньвіцкага павету, Маскоўскай губ., па школах і пры вучасткових больніцах арганізаваны каманды першай мэдыцынскай дапамогі. Праграма заняткаў у кожнай команде разьлічана на 20 гадзін, з практычнымі заняткамі ў лячэбніцы. Пасьля сканчэньня праграмы навучаньня каманды лічацца на вучоце ячэек ТДА-Авіяхіму і па першаму запатрабаванню зьбіраюцца на дадатковыя заняткі. Кожныя тры месяцы камплектуюцца новыя групы. Усяго ў павеце налічваецца 30 камандаў.

Сельсаветы перад выбарамі.

Маем дасягненьні.

Падыходзіць канец працоўнага году ў сельсаветах. Многа зроблена, многа наложана энэргіі, працы... Яшчэ многа трэба зрабіць.

Юраўскі сельсавет займае тэрыторыю ў 3700 дзесяцін.

У склад с.-с. уваходзяць 8 вялікіх вёсак і некалькі хутароў і засьценкаў агулам з 4374 ч. насельніцтва.

Земляўпарадкаваньне ў с-с. не праводзіцца, а насельніцтва вельмі жадае яго. Лік беднаты ў с-с. дасягае 45 пр. Кулакоў амаль няма: як відаць с-с. бедняцка-сераднянка характару. Батракоў на с-с. каля 15 ч., якія працуюць па дагаворах і вызьўляюцца сябрамі прафсаюзу.

Арганізацыйная праца сельсавету наладжана здавальняюча. Пры с-с. існуе пяць камісій з якіх толькі культурна-асьветчая і грашова-падатковая працуюць здавальняюча, іншыя працуюць слаба з прычыны незацікаўленасьці працай сяброў гэтых камісій і недахвату часу, бо сябры камісій летам ходзяць у заработкі.

Праца с-с. вядзецца плянава: пасяджэньні прызыдыуму с-с. адбываюцца кожную пяцідзелю; пленумаў—кожны месяц; сходаў сялянства 1-2 разы ў месяц, на якіх вырашаюцца пытаньні гаспадарча-бытавога характару.

Культурна-асьветнае становішча с-с. на належнай вышыні. Маецца 2 двухкамплектныя і 3 аднакамплектныя школы, 2 хаты-чытальні. Выпіска газэт у с-с. пашырана так, што ў сярэднім на 4-5 двароў—1 экзэмпляр газэты.

На тэрыторыі с-с. маецца 3 каапэрацыйныя крамы з лікам пайшчыкаў 441 ч., 1 пажарная дружына (в. Юрава), мэдычны пункт, які на жаль працуе дрэнна.

Лес мясцовага значэньня ў некаторых вёсках зьнішчаецца, прымаючы выгляд масавай парубкі (в. Мглё). Хуліганства яшчэ ня зьнішчана, але с-с. вядзе вялікую барацьбу з ім. На хуліганаў «прафэсыяналаў» накладаюцца штрафы, аддаюцца пад суд.

Нав.

в. Мглё, Юраўскага с-с., Смалявіцкага р.

Наказу ня выконвае.

Ужо прайшло 9 месяцаў ад тае пары, як быў абраны наш сельсавет, але за гэты доўгі час наш сельсавет нічога не зрабіў, не зважаючы на тое, што дадзены сельсавету наказ шмат чаго патрабаваў. Наказ гаварыў, каб аб адкрытых пасяджэньнях сельсавету было паведамлена насельніцтву, каб сельсавет працаваў па пляну, але гэта ня выканана.

Сельсавет працуе бяз пляну, аб пасяджэньнях ніхто нічога ня ведае. На пасяджэньні не зьяўляюцца нават сябры сельсавету, а тыя, што прыходзяць, замест таго, каб вырашаць пытаньні, часта на пасяджэньнях сьпяць, а ўсе справы вырашае старшыня і сэкратар сельсавету, як хочуць. У вёсцы няма ніякага пажарнага інвэнтару і набываць яго сельсавет нават ня думае. Усе масты і дарогі ў дрэнным становішчы, студні не абгароджаны, каля студняў заўсёды балота, нідзе няма цэбра. Аб асеньняй пасеўнай кампаніі сельсавет нават і ня думаў. Увесь час былі патравы, на якія сельсавет не зьвяртаў ніякай увагі. На руні ходзяць цэлыя табуны коняй, а сельсавет за ўвесь год ніводнага патраўшчыка не прыцягнуў да адказнасьці. Калі быў які небудзь кавалак зямлі ці сенажаці, дык ён нападаў не бедняку, а сельсавету. Лес мясцовага значэньня раскрадаюць кожны дзень, а сельсавет гэтым ня цікавіцца.

Дзяніс Духвалаў.

Рудня-Альхоўскі с.-с., Уваравіцкі р., Гомельшчына.

Праца кульгае.

За апошнія тры месяца працы сельсавету зусім распаталася. Апошняе пасяджэньне было, напэўна, з месяц таму назад.

Цяпер праходзіць водпуск лесаматар'ялаў, аналу і г. д. Гэта самае балючае пытаньне селяніна, але да яго сельсавет не надышоў, як сьлед.

Яшчэ загадзя сельсавет падаваў «сваім» пасьведчаньняў на права рубкі лесу; у выніку, калі прыслалі раскладку, то аказалася, што адпушчаную норму ўжо амаль што вырубілі, так што беднята, сем'і чырванаармейцаў засталіся бяз лесу.

Льготы па падатку і страхоўцы даваліся часткова не па прызначэньню,—адсюль скаргаў на сельсавет з боку беднякоў і сераднякоў цэлая груда.

Канцалярыя сельсавету бывае зачынена цэлымі тыднямі. а калі і зьявіцца хто адзін, старшыня ці сакратар, то пасядзіць 1-2 гадзіны ды да дому: свае справы важней, як грамадзкія.

Усё гэта трэба падлічыць і ў падыходзячыя выбары пагнаць з сельсавету такіх бюракратаў.

Селькор.

В. В.-Крушынаўка, Рагачоўскага райёну Бабруйскае акр.

І-я УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ПРАЦАУНІКОЎ МЯСЦОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ.

ПАСТАНОЎКА ВУЧОТУ.

Па пытаньню аб пастаноўцы вучоту ў мясцовай прамысловасьці зрабіў даклад т. Лавінскі, які зазначыў, што апошні перыяд часу характарызуецца адсутнасьцю арганізацыйна-рэгулюючага цэнтру ў мясцовай прамысловасьці. Гэта і прывяло да бяссыстэмнасьці ў працы рахункових апаратаў і самачынства як у пастаноўцы вучоту, так і справаздач.

Адсутнасьць намэнклятуры не давала магчымасьці складаць зводныя балянсы. Штаты рахункових апаратаў укамплектаваны няправільна. Адэтуль выцякае пытаньне аб строгай рэгламантацыі абавязкаў і функцый асобных катэгорый рахункових працаўнікоў і неабходнасьць перагляду штатаў.

Пастаноўка вучоту ў мясцовай прамысловасьці значна горшая, чымся ў распубліканскай. Адсутнасьць кіраўніцтва давяла да таго, што стары складны спосаб справаздач амаль што зусім не зьмяніўся.

Неабходна ўвязаць бухгальтарскую справу са статыстычнай, каб такім чынам палепшыць якасьць статыстычных матар'ялаў.

ПРАБЛЕМЫ ПРАЦЫ.

Даклад аб „праблемах працы" зрабіў тав. Шульман. З дакладу відаць, што адносіны між вытворчасьцю працы і зарплатай у мясцовай прамысловасьці насьпрыяючыя. Адсутнасьць якога небудзь рэгулюючага органу ў пытаньнях зарплаты прывяло да крайняй разнабойнасьці як у адносінах да разьмераў зарплаты, так і ў адносінах да сыстэм аплаты працы.

Ня станоўчы бок трэба адзначыць павышэньне рэальнай зарплаты, якое было ў сёлетнім годзе.

Асноўнымі прычынамі незначных дасягненьняў у галіне вытворчасьці працы зьяўляецца вельмі нізкая структура капіталаў мясцовай прамысловасьці, слабы працэс рэканструкцыі і адваўленьня прадпрыёмстваў, а таксама поўная адсутнасьць плянавай працы ў галіне працы.

Адзначаючы непадрыхтаванасьць у ёй сыстэмы мясцовай прамысловасьці да правядзеньня новай трыфнай рэформы, неабходна ўзмацніць падрыхтоўчую працу на пераводу ў наступным годзе, а ў некаторых выпадках і сёлета на новую сыстэму аплаты працы.

Каб забясьпечыць правядзеньне ў жыцьцё мерапрыёмстваў, накіраваных да павышэньня вытворчасьці працы, трэба ўдзяліць максымальную ўвагу пытаньням аховы працы.

РЭГУЛЯВАНЬНЕ І РАЗЬВІЦЬЦЁ САМАТУЖНА-РАМЯСЛОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ.

Па пытаньнях аб рэгуляваньні і разьвіцьці саматужна-рамясловай прамысловасьці зрабіў даклад тав. Гуіс. Дакладчык зазначыў, што дзяржаўная прамысловасьць яшчэ ня мае магчымасьці задаволіць усіх патраб вёскі ў таварах, а таксама ня мае магчымасьці скарыстаць лішкі рабочай сілы.

У БССР налічваецца 74.327 чалавек саматужнікаў і рамесьнікаў. З гэтага ліку ў вытворчыя арцелі каапэравана 6.870 чал., а ў крэдытна-пазычковыя т-вы 19.000 чалавек. Такім чынам усяго саматужнікаў і рамесьнікаў каапэравана 26.870 чалавек.

Каштоўнасьць валавой прадукцыі на ўсёй саматужнай прамысловасьці за 1926-27 г. дасягае 134.292.000 руб.; ці 56,6 проц. у адносінах да ўсяе прамысловасьці БССР

Саматужна-рамясловая прамысловасьць у тэхнічных адносінах вельмі адстала і нідзе сваю працу ўстаралымі спосабамі, што дрэнна адбіваецца на якасьці прадукцыі. Каб палепшыць тэхніку вытворчасьці і павысіць якасьць прадукцыі, неабходна, каб інспэкцыі мясцовай прамысловасьці па магчымасьці давалі тэхнічную дапамогу саматужнікам і рамесьнікам, а таксама і арцелям.

Па чатырох краінах

(Уражаньні і сапраўднасьць).

Спынка ў Карловых варах.

Толькі што мы прыехалі ў Карловы вары (Карсбад), як зразу нас спаткалі няпрыемнасьці. Праўда, гэтыя няпрыемнасьці не асабліва пякучыя і сустракаюцца яны з усімі тымі, хто бывае за рубяжом. У нас яны выліліся ў наступнае: прыехаўшы ноччу ў Карлсбад, мы наўпапад нанялі рэмізьніка і вялелі завезьці нас у бліжэйшы да крыніц готэль. Рэмізьнік, зразумела, вынаўніў нашу просьбу і завёз нас у шыкозную, комфортабельную гасьцініцу. За правоз злупіў ён у нас пяцьдзесят карон і далікатна, як важных чужаземцаў, перадаў готэльнай прыслузе. Тым чынам нас паднялі на ліфце, далі два добрыя пакоі і старонна ўважліва накармілі. Прагаладаўшыся за дарогу, мы пахвалілі вячэру, як адну з лепшых. Затое, калі прыйшлося разьлічвацца, дык мы і языкі высалапілі: вячэра абышлася ў 165 карон! Кошт пакояў таксама паказваў нелапую лічбу—за адзін—50 карон бяз услугаў ды налогу, за другі—80 карон бяз гэтых дадаткаў. Самі на сабе гэтыя грошы і ня зусім вялікія, параўнаўшы, напрыклад, з коштам пакояў у Маскве ці ў Харкаве, дзе згодна Карлсбацкім цэнам—гэта было ачула. Вось гэтая ачуласьць і паслужыла для нас Міхасёў (Чарота і Зарэцкага) козыр у рукі для ўніку вяне за прыезд у Карловы вары. І паміж сабою і пры мне яны касілі на мяне вочы і падпускалі шпількі. Я маўчаў, ня маючы чаго сказаць у адказ. Тым болей маё становішча рабілася цікавым, што толькі праз мяне яны заехалі ў Карловы вары і ўсяму быў я віноўнікам. Я, прызнацца, адчуваў сябе няцікава, бо ведаў, што ў верасьні месяцы ня вельмі замачыў курортны адпачынак, пры гэтым асабліва для таго, хто яго мала патрабуе. Наконт здароўя, дзякуй богу, М. Зарэцкі ня мог маракаваць, а Чароту таксама не вымагала гэтага. Уся каша заварылася з-за мяне... Але я меў пры сабе адно—абяцаньне Міхасёў у час паездкі ўлучыць дзесяць дзён на адпачынак. Яны помнілі гэта і, нагадзіўшыся з становішчам, лягілі адпачываць...

Праз ноч, як і трэба было чакаць, наш агульны настрой пераіначыўся. Імпануруючыя абставіны ў готэлю, надзвычай чыстым і комфортабельным, дзіўны выгляд з яго вакна на мясцовасьць—падавалі бадзёрага пачуцьця. Яго не астуджываў і спорны восенны дождж, цадзіўшы з цёмных хмар, як з лупа... Мы глядзелі на высокія, убраныя зялёным лесам горы, на якіх ляніліся большыя і меншыя дачы, па разьлёгны наміж іх вызнатаю далінаю горад і цешыліся харасцвом. Ізнэў паўсталі каразьлівыя запытаньні, калі давядзецца яшчэ раз бачыць гэта? Паэтычны настрой казытаў наша нутро, малюючы вобразы—сказы... Нам прадстаяла найсьці пэўнейшае для абсталяваньня месца, а Міхасі і забылі аб гэтым. Многа разоў я дапомніў ім аб гэтым, пакуль яны адарваліся ад вакна! Нарэшце мы пайшлі ў горад і ўсё гладка і добра справілі: нашлі даступныя па цане пакоі, перанесьліся ў іх, разгарнуліся як дома, пасьнедалі. А полудні сабраліся ісьці да доктара, каб далей пачаць патрэбнае лячэньне... Калі не рабіць гэтага, тады і ня варта наведваць Карловых вар. Калі-ж ужо заехалі ў іх, чаму-ж ня выкарыстаць сваё быцьцё? А Карловы вары, як ні-як, здатны даць лекі кожнаму, хто хворы і хто не асабліва нядужае.

Гэта ўлічвалі абодвы Міхасі, з якіх Чарот ня вельмі можа пахваліцца на моц сваіх нэрваў. І мы адназгодна накіраваліся да доктара...

Але толькі выйшлі за дзьверы, як зусім нечакана наткнуліся на Янку Купалу з жонкаю. Трэба ўявіць сабе тое здавальненьне, якое нас ахапіла пры гэтым! Сустрэць на чужыне малалмальскі знаёмага чалавека—вельмі прыемна.

А то-ж былі... Янка Купала з Купаліхай.

Мы зараз-жа кінуліся на распытаньні да іх, як да «старажылаў», завалалі іх да сябе і амаль не прасядзелі прыёмны ў дактароў тэрмін. Праўда, Янка цаніў час пазагранічнаму, успрыняўшы вельмі блізка да сарца курортную дысцыпліну, і ён ня даў нам заседзіцца. У яго былі ўжо знаёмыя дактары, ведаў ён усе хады і выхады, што датычыць мейсцазнаходжаньня крыніц; і мы зразу накіраваліся на пэўныя адрасох. На дарозе ўжо мы пераказалі сваё зьдзіўленьне ад стрэчы, якое ніяк не чакалі.

Па нашым рахубам Янка Купала ў час нашага прыезду мусіў ужо быць у Менску і, па звычаю насіцца з палачкаю ў руках з дому ў Інбелкульт, а з Інбелкульту ў Дзяржвыдавецтва... А гэта...

Дзякуючы гэткай нечаканасьці, мы хутка былі ўведзены Янкам Купалаю з цёткаю Уладыславаю ў курс Карлсбадзкіх лекаў... З гэтага-ж дню яны ў нас найшлі так, як быццам бы мы прабылі ў Карловых варах ня менш Янкі Купалы...

Гэты паварот «ходу вещей» дарэшты разагнаў у Міхасёў першыя ўражаньні. Яны таксама старэнна, як і я, бралі прынісаныя доктарам працэдуры, пілі воду з кубачкаў, знарок ідзеля гэтага купленых, і фарсіста спацыравалі ў калёнадах.

Разам, кампаніяю, пад кіраўніцтвам Янкі Купалы, які стаў нашым чычэроне, мы даведаліся аб знатнейшых мяйсцох Карловых вар і іх ваколіц. Гэтым-жа днём мы ўжо пасьнелі падняцца па горнай чыгунцы на адну з вяршын, дзе стаіць башта (разгледня), і аглядзелі Карлсбад з вышыні. Чародным днямі мы наведалі некалькі прыгажэйшых ваколіц, мейсцаў забаў, чэскі клюб і інш... Праграма аглядаў вырастала ў вачавідкі і яе хапіла-быдадоўга... Але часткаю Янка Купала выпаўніў яе бяз нас, а надалей у яго не аставалася часу. Якраз яны з жонкаю былі намераны ад'яжджаць, калі мы прыехалі. І ўжо дзеля нас імі было ахвярована некалькі дзён Карловым варам...

Дзень ад'езду Янкі Купалы з жонкаю падаў чатырма днямі раней тэрміну, наложанага намі на прабыцьцё ў Карловых варах. Тым ня меней мае Міхасі раньлі пакінуць мяне аднаго і ехаць з Янкам.

Я адзнаваў, што ім весялей і карысьней будзе гэтыя дні пражыць у Празе, чымсь у Карлсбадзе. Тым болей, што іх хвароба нават з пункту гледжаньня доктара дазваляла ім гэта. Пярэчыць, або злаваць на іх, ня было за вошта... І я, як водзіца, патаварыску правёў іх на вакзал, застаўшыся каратаць свой тэрмін адным.

У Карловых варах хапала цікавасьці, каб ня нудзець і аднаму, занадта ўжо багаты ён прыродным хараством! Аднак мне рупела хутчэй ехаць у Прагу. Там ужо чакалі нас, (згодна паведамленьню ад беларускіх студэнтаў), ведаючы, што мы навінны прыехаць... Аб Янку Купалу да нашага прыезду газэты пасьпелі паведаміць чэха-славацкую грамадзкасьць. У многіх з іх ужо быў зьмешчаным яго партрэт. Таксама сумелі з ім пазнаёміцца некаторыя з пісьменьнікаў, як Е. Гора, Вайскопф і інш. Аднак намечаную праграму ў навязаньні культурнае сувязі з чэскім пісьменьніцкім і культурніцкім сьветам мусілі мы выпаўняць агулам Знача, мая адсутнасьць у некай долі перашкодзіла гэтаму. Цэнючы справу культурнае сувязі, якваграмнейшы фактар у жыцьці нашае распублікі, мне карцела як найхутчэй адправіцца ў Прагу. Да гэтага, у нашым распарадженьні аставалася зусім нямнога часу на бываньне ў Чэха-Славаччыне. Усё разам і заставіла мяне абарваць лячэньне, ды пакінуць Карловы вары. 17 верасьня я накіраваўся ў Прагу.

Каб і хацеў, дык нельга ня спыніцца на тэй прыгожасьці мясцовасьці, якая злучае Карловы вары з Прагаю. Цягнік ад Карловых вар да Прагі ідзе чатыры гадзіны. Пачынаючы ад Карловых вар, ён зразу ўваходзіць у гарыстую мяйсцовасьць. (Сама чыгунка называецца нагорнаю). Крыху праехаўшы крутымі загінамі, ён падбягае да шпарка бягучае нелапае рачкі. І на працягу каля двух гадзін увесь час нясецца поруч яе, то перабягаючы на адзін бок, то на другі. Абапал цягніку, які гадзіною ў'ецца то на ўздым, то са здымy, паднімаюцца высокія мачтовыя горы. У глыбокіх лагох паміж гарамі растыканы белыя мураваныя хаткі вёсак. Вакол іх—прыбранае, выхаснае поле, лугі. Шашовыя дарогі, утыканыя з двух бакоў белымі каменьчыкамі, уносяцца ў цёмныя лясы гор, агібаюць іх, гінуць і вынікаюць напова. Едзеш і

Хроніка.

У Нар. Кам. Раб.-Сял. Інспэкцыі.

АБ НЕНАРМАЛЬНАСЬЦІ Ў ПАБУДОВЕ МЕНСКАГА ХАЛАДЗІЛЬНІКА.

Калегія НК РСІ ўстанавіла, што з боку Менскага адд. „Хладстроя" рабілася павялічэньне выдаткаў на адм.-тэхн. і кіраўнічыя патрэбы ад 4 да 7,5 проц. з прычыны раздутых штатаў, неправідловай тарыфікацыі разрадаў служачым, павялічэньня нагрузкі малодшаму пэрсаналу і інш.

Калегія настанавіла скараціць штат на 7 чал. і абвясьціла выгавар інжэнэру Палянскаму, які нарушыў дырэктывы аб зьнімэньні выдаткаў.

ВЫГАВАР ЗА БЮРАКРАТЫЗМ.

Калегія НК РСІ абвясьціла выгавар нам. пракурора Аршанскай акругі т. Собалеву-Уральскаму за дапушчаную ім цыганіну і бюракратызм у справе дапамогі сялянам в. Плоскай, Талачын. р., хутчэй атрымаць пажарную машыну.

СКАРГА СТУДЭНТАЎ.

Калегія НК РСІ прызнала, што стыпэндыю студэнтам за верасень г. г., камандыраванным у ВНУ за межы БССР, неабходна выдаць, дзеля чаго запрапанавана НК Асьветы ўвайсьці з хадайнічаньнем у СНК аб водпуску сродкаў.

Пры нармаваньні зарплаты павялічваецца пэнсія адстаўшых груп.

Ва ўстановах, якія знаходзяцца на гаспадарчым разрахунку, дагэтуль у зарплаце служачых назіраецца надзвычайная неаднолькавасьць у стаўках. У сувязі з гэтым, Наркамправы ў бліжэйшыя часы намячае правесьці нармаваньне зарплаты працаўнікоў гэтых устаноў.

У першую чаргу нармаваньне будзе праведзена ў органах сацстраху, касах ашчаднасьці, дзяржстраху і кредытных установах. У іншых-жа ўстановах уводзіцца сыстэма акладаў пэнсіі па пасадах на падставе калдагавораў уставоў з адпаведнымі прафсаюзамі.

Як першае, так і другое мерапрыёмства ліквідуе ўжываньне розных тарыфных справачнікаў, якія давалі магчымасьць кожнай установе фактычна прыстасоўваць стаўкі па свайму погляду. Нармаваньне ўстанаўлівае цьвёрды аклад, узаконены органамі Наркамправы, і піводная ўстанова ня мае права выходзіць з рамак стаўкі адпаведнай пасады

Па ўстановах дзяржаўнага бюджэту нармаваньне зарплаты праведзена ўжо поўнасьцю, а па мясцовому бюджэту нармаваньне ахапіла 90 проц. усіх пасад, а рэшта будзе нармавана да 1 красавіка 1928 г.

Пры правядзеньні нармаваньня зарплаты па ўстановах дзяржаўнага і мясцовага бюджэту **павялічэньне пэнсіі атрымалі ў першую чаргу адстаўшыя групы працаўнікоў, як настаўніцтва, мэдпэрсанал, сельскія спэцыялісты, міліцыя і інш. На гэту мэту асыгнавана дадаткова 3 проц. ад усяго фонду зарплаты, што складае на год 1.000.000 руб.**

Прыезд у Менск нямецкіх купцоў.

Учора прыехалі ў Менск прадстаўнікі буйных нямецкіх фірмаў гр. Грау і Гэйман. Купцы маюць намер закупіць у БССР буйную партыю лясных матар'ялаў. Зараз Грау і Гэйман выяжджаюць на месца для азнаямленьня з якасьцю матар'ялаў.

Асыгнаваньні на ліквідацыю няпісьменнасьці.

Цэнтральная бюджэтная камісія прыняла ў бюджэт 890 сеткавых ліквпунктаў і 190 школ малапісьменных, на што асыгнавана 321752 руб. Культурная сэкцыя Дзяржпляну на гэту мэту вызначыла дадаткова 175.000 руб.

У кузьні культурных працаўніковуёвёскі.

За час існаваньня Беларускай сельска-гаспадарчай акадэміі і падлеглых ёй інстытутаў выпушчана 781 студэнт. У гэтым годзе ў акадэміі навучаецца 1417 студэнтаў.

Вярнуўся з Ленінграду тав. Галубок.

Кіраўнік Беларускага дзяржаўнага вандроўнага тэатру тав. Галубок вярнуўся з Ленінграду, дзе яму была зроблена цижкая аперацыя ў полаасьці носа-глоткі.

Пастаноўкі трупы Галубка.

У пятніцу, 9 сьнежня, Беларускі дзяржаўны тэатр пад кіраўніцтвам Галубка ў Цэнтральным Доме Асьветы ставіць драму ў 5 актах „Пытагоны"; у суботу ў клюбе скурнікаў і ў нядзелю ў Доме Чырвонай арміі драму ў 5 актах „Падкідыш".

275.000 руб. на аднаўленьне і капітальны рамонт нватэр.

Менскі камунальны аддзел у гэтым годзе мяркуе правесьці вялікія работы на аднаўленьню 12 камунальных дамоў і апрача гэтага у 15 дамох—дробны рамонт. На гэтую мэту асыгнавана 275.000 рублёў.

Дарожнае будаўніцтва.

За мінулы 1926-27 г. па Менскай акрузе (у старых яе межах) адбудаваны па дарогах акруговага, раённага і сельскага значэньня 263 масты розных канструкцый, агульнай даўжынёю ў 2581 мэтр.

Укамплектаваньне БДУ навуковымі працаўнікамі.

Калегія Наркамасьветы запрапанавала праўленьню БДУ усе пытаньні ўкамплектаваньня працаўнікоў вырашаць і праводзіць у час з 15 чэрвеня па 1 жніўня. Катэгарычна забаронены ўсялякія звальненьні і прыёмы навуковых працаўнікоў у сярэдзіне навучальнага году.

Камсамольская каляда.

Камсамольскія арганізацыі распачалі падрыхтоўку да надыходзячых калядаў. Вясковыя ячэйкі рыхтуюць антырэлігійныя вечары, спэктаклі і інш.

У горадзе юнсэкцыі клюбаў арганізуюць вечары і выстаўкі антырэлігійнай літаратуры.

4.066 працоўных прайшло праз дамы адпачынку.

За 1926-27 гаспадарчы год Менская акруговая страхкаса прапусьціла праз дамы адпачынку 4.066 працоўных. Апрача гэтага, паслана на курорты на сродкі сацстраху—150 чал.

Дзіцячая сьмертнасьць паменшылася.

У даваенныя гады ў Менску на кожныя 1000 нарадзіўшыхся дзяцей памірала 33,3; у 1923 годзе—19,5 і ў 1926 годзе сьмертнасьць дзяцей супроць даваенных часоў ужо зьнізілася да 12,2.

Новая аўтабусная сувязь з райёнамі.

У бліжэйшы час будзе наладжана аўтабусная сувязь з Лагойскам. Работа па спраўленьню дарогі Менск—Лагойск ужо скончана, а з вясны будзе гэтая праца весьціся да Плешчаніц. Такім чынам у гэтым годзе адкрыецца новая аўтабусная лінія Менск—Астрашыцкі-Гарадок — Лагойск — Плешчаніцы.

З вясны будзе прыступлена да спраўленьня дарогі Менск—Самахвалавічы і далей на Грозава з разрахункам устанавіць аўтабусныя зносіны Менск—Самахвалавічы—Грозава. Гэтая аўтабусная лінія будзе абслугоўваць Копыльскі, Граскі і Узьдзенскі райёны.

Вэтэрынарная сувязь з замежнымі краінамі.

Дзеля ўрэгуляваньня вэтэрынарна-санітарных узаемаадносін паміж Савецкім Саюзам і замежнымі краінамі, Савет Працы і Абароны пастанавіў прызначыць пры гандлёвых прадстаўніцтвах ад СССР 7 вэтэрынараў-кансультантаў. Ад Савецкай Беларусі будзе вызначан адзін вэтэрынар-кансультант.

Падрыхтоўка да вясеньняй сяўбы.

ЦК сялянскіх к-таў узаемадапамогі даў загад раённым і сельскім к-там узаемадапамогі загатовіць да вясеньняй сяўбы 500 тысяч пуд. збожжа. Для ачысткі насеньня будуць працаваць вясной 315 пракатных пунктаў.

Сельска-гаспадарчыя т-вы—сябры Осо-Авіяхіму БССР.

Улічваючы вялікае значэньне Осо-Авіяхіму ў справе абароны СССР, праўленьне Белсельсаюзу запрапанавала ўсім сельска-гаспадарчым таварыствам уступіць у сябры Осо-Авіяхіму. Сяброўскі ўзнос для сельска-гаспадарчых т-ваў устаноўлен у 2 руб. у год і ўступны—1 руб.

ФІЗКУЛЬТУРА.

Выстаўка па фізкультуры.

Дзеля папулярнасьці фізкультуры ў некаторых адсталых па арганізацыі ФК прафсаюзных клюбах, Менскі АСФК наладзіць выстаўку-перасоўку. Выстаўка ў першую чаргу будзе накіравана ў клюб саюзу прам. нар. харчаваньня, кам. гаспадаркі, скурнікаў, нарсувязі.

Вечар ФК.

25 сьнежня Менскі акр. СФК ладзіць агульна-гарадзкі вечар фізкультуры, збор з якога пойдзе ў фонд арганізацыі 3-х сусьветных рабочых спартакіядаў (Маскоўскай, Нарвасскай, Пражскай).

Фізкультура на заводзе „Беларусь".

На заводзе „Беларусь" праведзены стральковыя спаборніцтвы, прайшоўшыя вельмі пасьпешна.

На першым месцы рабочы т. Кынст (34 з 50), на другім Брэйва і Палойка і на трэцім рабочы 60-ці год Іваноў.

Усяго ўдзельнічала 25 чалавек.

Спаборніцтвы Менск—Бабруйск.

У канцы сьнежня ў Менску адбудуцца міжгародняя спаборніцтвы па саюзу савпрапаўнікоў Менск—Бабруйск па гімнастыцы, падняцьню пяжараў, барбе і пінг-понгу.

Законы і загады ўраду БССР.

ПАСТАНОВА Савету Народных Камісараў БССР

аб ліквідацыі Штатнай Камісіі пры Народным Камісарыяце Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі БССР.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Ліквідаваць Штатную Камісію пры Народным Камісарыяце Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі БССР.

2. У зьвязку з гэтым скасаваць пастанову Савету Народных Камісараў БССР за 10 красавіка 1926 г. „Аб зацьверджаньні Палажэньня аб Штатнай Камісіі пры Народным Камісарыяце Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі БССР" (З. З. БССР 1926 г., № 18, арт. 63) і пастанову Савету Народных Камісараў БССР за 7 ліпеня 1927 г. „Пра зьмену Палажэньня аб Штатнай Камісіі пры Народным Камісарыяце Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі БССР" (З. З. БССР 1927 г., № 30, арт. 153).

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **М. Мароз.**

14 лістапада 1927 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ Совета Народных Комиссаров БССР.

о ликвидации Штатной Комиссии при Народном Комиссариате Рабоче-Крестьянской Инспекции БССР.

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Ликвидировать Штатную Комиссию при Народном Комиссариате Рабоче-Крестьянской Инспекции БССР.

2. В связи с этим отменить постановление Совета Народных Комиссаров БССР от 10 апреля 1926 г. «Об утверждении Положения о Штатной Комиссии при Народном Комиссариате Рабоче-Крестьянской Инспекции БССР» (С. З. БССР 1926 г., № 18, ст. 63) и постановление Совета Народных Комиссаров БССР от 7 июля 1927 г. „Об изменении Положения о Штатной Комиссии при Народном Комиссариате Рабоче-Крестьянской Инспекции БССР" (С. З. БССР 1927 г., № 30, ст. 153).

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР **Н. Голодед.**

Управляющий Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР **М. Мороз.**

14 ноября 1927 года
г. Минск.

ПАСТАНОВА Савету Народных Камісараў БССР

аб стане рынку працы і аб мерапрыёмствах па змаганьні з беспрацоўем.

Выслухаўшы даклад Народнага Камісара Працы БССР аб стане рынку працы і аб правядзеньні мерапрыёмстваў па змаганьні з беспрацоўем, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Прызнаць, што Народным Камісарыятам Працы праведзен шэраг новых мерапрыёмстваў у галіне арганізацыі і рэгуляваньня рынку працы ў паасобку, значна палепшана пасрэдніцкая дзейнасьць бірж працы, што давяло да большага ахапленьня наймаными (якое павялічылася з 33,7 проц. у 1926 годзе да 51,6 проц.—у 1927 годзе); пачата работа па рэгуляваньні руху сельскага насельніцтва на заработкі; унесена плянавасьць у справе рэгуляваньня сэзоннага рынку працы, асабліва—будаўнічага, і павялічаны процант насылкі на работу жанчын і падлеткаў. Разам з гэтым Савет Народных Камісараў адзначае, што да гэтага часу органамі Народнага Камісарыяту Працы попыт на рабочую сілу поўнасьцю яшчэ не ахоплены; гэта ў значнай меры тлумачыцца тым, што наймальнікі абходзяць біржы працы да гэтага часу.

2. Ухваляючы лінію Народнага Камісарыяту Працы ў справе працоўнай і натуральна-грашовай дапамогі беспрацоўным, якая адыграла вельмі важную ролю ў справе зьмягчэньня вастраты беспрацоўя і якая дала магчымасьць ахапіць дапамогаю значную частку беспрацоўных, галоўным чынам, некваліфікаваныя групы жанчын і падлеткаў, даручыць Народнаму Камісарыяту Працы ўжыць захады да пашырэньня ўсіх відаў працоўнай дапамогі ў 1927-28 гаспадарчым годзе, у паасобку грамадзкіх работ, працоўных калектываў і мерапрыёмстваў па навучаньні беспрацоўных кваліфікацыі, зьвярнуўшы ўвагу на падвышэньне гаспадарчай мэтазгоднасьці і працаёмістасьці гэтых работ.

3. Адзначаючы выпадкі нядбайнага складаньня плянаў грамадзкіх работ, лічыць патрэбным, каб далей на складаньне плянаў грамадзкіх работ была зьвернута асаблівая ўвага. Катэгарычна прапанаваць акруговым выканаўчым камітэтам не дапушчаць выпадкаў парушэньня плянаў грамадзкіх работ.

Народнаму Камісарыяту Працы пры разасьнаваньні сродкаў для дапамогі беспрацоўным на акругах у асноўным грунтаваць на мэтазгоднасьці плянаў грамадзкіх работ.

4. Адзначаючы, што працоўныя калектывы, як органы, якія даюць працоўную дапамогу значнаму кадру найбольш цэнных груп беспрацоўных і адначасна даюць магчымасьць навучаць беспрацоўных кваліфікацыі і тым самым захоўваюць іх ад дэкласаваньня, зьяўляюцца адным з важнейшых мерапрыёмстваў па змаганьні з беспрацоўем. Савет Народных Камісараў лічыць патрэбным і далей усімі спосабамі пашырыць гэты від дапамогі, біручы пры гэтым пад увагу патрэбу ўзмацненьня ў працоўных калектывах беспрацоўных, якія прыдуць на біржы працы ў выніку рацыяналізацыі вытворчасьці і дэмабілізацыі з Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі.

Запрапанаваць акруговым выканаўчым камітэтам рабіць патрэбную дапамогу органам Народнага Камісарыяту Працы ў гэтай рабоце (даўшы ім патрэбныя памкнаньні і інш.).

5. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Працы ажыцьцявіць патрэбныя мерапрыёмствы, накіраваныя да большай зьменнасьці беспрацоўных у працоўных калектывах, устанавіўшы ў кожным з іх тыя асноўныя кадры, якія ня могуць зьмяняцца як сапраўдна патрэбныя для вядзеньня бесперабойнай працы.

6. Запрапанаваць акруговым выканаўчым камітэтам узмацніць работу па перадачы ўзмацнёных працоўных калектываў з пад ведама органаў Народнага Камісарыяту Працы ў агульную сетку прадпрыёмстваў мясцовай прамысловасьці па ўмовах, устаноўленых Эканамічнаю Нарадаю пры СНК БССР.

7. Біручы пад увагу павялічэньне ліку беспрацоўных, занятых у працоўных калектывах, і разьвіцьцё вытворчай і гандлёвай дзейнасьці працоўных калектываў, прызнаць патрэбным павялічыць крэдыты для працоўных калектываў у залежнасьці ад далейшага пашырэньня іх работы. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Гандлю і Вышэйшаму Савету Народнае Гаспадаркі ўзмоцніць увагу ў адносінах да плянавага забесьпячэньня іх патрэбным мясцовым і імпортным сырцом.

8. Адзначаючы, што да гэтага часу большая частка акруговых выканаўчых камітэтаў ня выканала дырэктыў аб палепшаньні ўмоў работы бірж працы, ня даўшы ім прыстасаваных для вядзеньня нармальнай работы памяшканьняў, абавязаць акруговыя выканаўчым камітэты ўжыць на працягу месяца захады да ўрэгуляваньня гэтага пытаньня, прадугледзіўшы ў мясцовым бюджэце патрэбныя на гэта сродкі.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Працы далажыць Савету Народных Камісараў аб выніках ажыцьцяўленьня гэтай пастановы.

9. У зьвязку з павялічэньнем ліку адыходзячага на заработкі сельскага насельніцтва і для паляпшэньня збору гэтых кадраў у гарадох, даручыць Народнаму Камісарыяту Працы пашырыць сетку карэспандэнтаў-інфарматараў у раёнах з найбольшым адыходам, а таксама арганізаваць пры біржах працы спэцыяльныя сэкцыі для абслугоўваньня беспрацоўных сэзонных прафэсій (галоўным чынам—будаўнікоў) і для лепшага задавальненьня патрэб гаспадарчых арганізацый у рабочай сіле. Дазволіць Народнаму Камісарыяту Працы скарыстаць для правядзеньня гэтага мерапрыёмства 5.000 рублёў з сум, асыгнаваных у дзяржаўным бюджэце на змаганьне з беспрацоўем.

10. Для больш пасьпяховага змаганьня з беспрацоўем і для лепшага скарыстаньня кадраў беспрацоўных, якія цяпер ёсьць, лічыць патрэбным пачаць работу па падрыхтоўцы нехапаючай кваліфікаванай рабочай сілы з ліку беспрацоўных і сельскага насельніцтва БССР.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства, Вышэйшаму Савету Народнае Гаспадаркі, Народнаму Камісарыяту Працы і Народнаму Камісарыяту Асьветы на працягу месяца распрацаваць плян падрыхтоўкі кваліфікаваных тарнянікоў і грабароў. Народны Камісарыят Працы павінен распачаць арганізацыю навучаньня на курсах Цэнтральнага Інстытуту Працы найбольшай колькасьці будаўнікоў, тынкавальшчыкаў, бэтоньшчыкаў і мулярoў з ліку беспрацоўных.

11. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства ўвязаць сваю работу на перасяленьні з Народным Камісарыятам Працы і яго органамі на месцах з тым, каб у кантынгэнт перасяленцаў уключаліся беспрацоўныя, зарэгістраваныя на біржы працы, якія маюць жаданьне перасяліцца.

12. Абавязаць Народны Камісарыят Асьветы неадкладна распрацаваць ажыцьцяўленьне ўсіх патрэбных мерапрыёмстваў па арганізацыі культурнага абслугоўваньня беспрацоўных, узгодніўшы гэтую работу з Народным Камісарыятам Працы і Цэнтральным Саветам Прафэсыянальных Саюзаў.

Народны Камісарыят Асьветы і Народны Камісарыят Працы на працягу двух месяцаў павінны далажыць Савету Народных Камісараў аб выкананьні гэтай дырэктывы.

13. Даручыць Народнаму Камісарыяту Працы зрабіць усе захады для атрыманьня ад Народнага Камісарыяту Працы СССР парадаў па вярбоўку рабочай сілы ў межах БССР для іншых мясцовасьцяй Саюзу ССР, у паасобку для ўральскіх лесарасрацовак.

14. Да зацьверджаньня ў саюзных органах бюджэту БССР на 1927-28 год, а таксама да вызначэньня асыгнаваньня па лініі сацыяльнага страхаваньня на працоўную і грашовую дапамогу беспрацоўным—прыняць арыентыровачны агульны выдаткі на мерапрыёмствы па змаганьні з беспрацоўем у БССР на 1927-28 год у суме 3.700 тысяч рублёў.

Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Працы і Дзяржаўнай Плянавай Камісіі пасьля зацьверджаньня бюджэту ўдакладніць гэтую суму і разьмеркаваць яе па акругах і па асобных відах мерапрыёмстваў змаганьня з беспрацоўем, надаўшы гэтае разьмеркаваньне на зацьверджаньне Эканамічнае Нарады.

15. Запрапанаваць Эканамічнай Нарадзе пры СНК БССР абмеркаваць пытаньне аб выдзяленьні доўгатэрміновых крэдытаў за рахунак вэксаляў, якія атрымоўваюцца працоўнымі калектывамі ад прамысловых і іншых арганізацый з тым, каб гэтыя вэксалі дыскантаваліся-б у Камунальным Банку.

16. Даручыць Народнаму Камісарыяту Працы і Цэнтральнай Статыстычнай Управе падаць у Дзяржаўную Плянавую Камісію балянс працы на БССР, забясьпечаўшы паданьне Народнаму Камісарыяту Працы адпаведных зьвестак ведамствамі.

Цэнтральная Статыстычная Ўправа павінна якнайхутчэй апрацаваць матар'ялы, патрэбныя для гэтай работы.

17. Даручыць Народнаму Камісарыяту Працы ажыцьцявіць патрэбныя мерапрыёмствы для палепшаньня пастаноўкі экспэртызы беспрацоўных, зьвярнуўшы ўвагу на патрэбу рабіць яе рэгулярна і на патрэбу больш сур'ёзнага падыходу прадпрыёмстваў да арганізацыі фактычна экспэртызы. Асыгнаваць на гэта дадаткова 4.000 рублёў, крыніцу якіх вызначыць Народнаму Камісарыяту Фінансаў.

18. Для далейшага павялічэньня працоўнай дапамогі некваліфікаваным катэгорным беспрацоўных і для задавальненьня патраб гарадоў у прадуктах садоўніцтва і гародніцтва, даручыць акруговым выканаўчым камітэтам пачаць з гэтага году арганізацыю ў шырокіх размерах садова-гародных гаспадарак на гарадзкіх землях Народны Камісарыят Працы павінен выдзеліць частку сродкаў з фонду на змаганьні з беспрацоўем для аплаты рабочай сілы з беспрацоўных, пераважна некваліфікаваных, занятых на гэтых работах.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства і